№ 39 – 40 (812 – 813)
Кастрычнік 2020 года

# Краязнаўчая газета

Выдаецца з красавіка 2003 года
kazeta.by bfk.by

## У нумары:

☞ **Канферэнцыя:** *захаванне і папулярызацыя спадчыны праз музейную дзейнасць –* стар. 2

☞ **Даклады:** *турыстычны патэнцыял Гомельшчыны і сядзіба Святаполк-Чацвярцінскіх у Жалудку –* стар. 4 і 5

☞ **Прэзентацыя:** *новыя пераклады Элізы Ажэшкі –* стар. 10

Назіранне за жураўлямі на балоце Ельня пад час свята «Жураўлі і журавіны Мёрскага краю»



Падрабязней чытайце на стар. 9

### Падпіска 2020 → Падпіска 2021

*Добрага здароўя! Не толькі супрацоўнічаць, але і падпісвацца на паважаную газету буду!!! Бо я крыху духам пала, калі ў апошнім нумары прачытала крык душы, быць газеце ці не...*

*Аж слёзы на вачах выступілі. Канечне, сучасны інтэрнэт зрабіў сваю... справу, але ж у газеце пішуцца такія звесткі, што парой і ў галаву не прыйдзе шукаць штосьць падобнае ў тым інэце, а тут – разгарнуў газету, а там найцікавейшы матэрыял. Вельмі шкада, што культура адыходзіць на іншы план, мала фінансуецца. Я свае паэтычныя зборнікі даўно выдаю за свой кошт, таму добра ведаю, як гэта цяжка. Але ўчора, выступаючы ў адной са школ Салігорскага Палесся на сваце Беларускага пісьменства і культуры (калі Вас зацікавіць – напішу невялікі артыкул і фота дадам), вяла размову і пра нашу «КГ», прасіла выпісаць яе на наступны год.*

*Асабіста я буду і далей выпісваць і чытаць, і сяброўка паабяцала. Буду яшчэ тэлефанаваць сябрам з такой прапановай. А вам – вялікі дзякуй за публікацыі, чакаю наступных нумароў. Будзьце здаровыя.*

*Шчыра –*
*ад Валянціны Бабко-Аляшкевіч.*

*Навукова-практычная канферэнцыя*

## На радзіме плеяды выбітных асобаў

Навукова-практычная канферэнцыя «Беларусь, Глыбоцкі край і Эдвард Вайніловіч» прайшла ў канцы верасня ў Глыбокім. Яе арганізатарамі выступілі Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Глыбоцкі раённы выканаўчы камітэт, Міжнародны дзяржаўны экалагічны інстытут імя А. Сахарава Белдзяржуніверсітэта і ксёндз-магістр, пробашч касцёла Святых Сымона і Алены ў Мінску, кандыдат гістарычных навук Уладзіслаў Завальнюк.

Шматлікіх удзельнікаў канферэнцыі – навукоўцаў, выкладчыкаў вышэйшых навучальных установаў краіны, а таксама педагогаў і вучняў раёна – вітаў старшыня Глыбоцкага райвыканкама Аляксандр Шубскі. Аляксандр Мікалаевіч адзначыў, што выбар Глыбоччыны як пляцоўкі для правядзення навукова-практычнай канферэнцыі невыпадковы. Гэты раён падарыў свету плеяду славутых мастакоў і пісьменнікаў, навукоўцаў, палітычных і грамадскіх дзеячаў.

– Упэўнены, што правядзенне такога значнага мерапрыемства будзе садзейнічаць духоўнаму развіццю і павышэнню цікавасці жыхароў нашага раёна да гісторыі, а таксама адкрые новыя імёны будучых гісторыкаў-даследчыкаў, – сказаў кіраўнік раёна. – Плённай вам працы, цікавых дыскусій і новых адкрыццяў. І няхай вашы поспехі і дасягненні ў прафесійнай дзейнасці будуць накіраваныя на захаванне гістарычнай памяці беларускага народа, міру і стабільнасці ў грамадстве.

З прывітальным словам да ўдзельнікаў канферэнцыі звярнуліся таксама намеснік дырэктара па навуковай рабоце Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт Вадзім Лакіза, пробашч касцёла Святых Сымона і Алены ў Мінску, кандыдат гістарычных навук Уладзіслаў Завальнюк, равін Віцебска Малкіэль Гаргодзэ, благачынны Глыбоцкай акругі, протаіерэй Міхаіл Ізаітка і біскуп Віцебскай дыяцэзіі Алег Буткевіч.

Усе выступоўцы асабліва адзначылі, што на беларускай зямлі спрадвеку ў міры ды згодзе жылі прадстаўнікі розных канфесіяў. І канферэнцыя ў Глыбокім – яскравае сведчанне таго, што добрая культурная традыцыя працягваецца і сёння.

Пасля пленарнага пасяджэння праца працягвалася ў трох навукова-практычных секцыях, дзе з дакладамі выступілі каля 50-і чалавек: навукоўцы, выкладчыкі ВНУ краіны, супрацоўнікі Глыбоцкага гісторыка-этнаграфічнага музея, педагогі і вучні школ раёна.

У рамках канферэнцыі была арганізаваная выстава «Малой радзіме прысвячаецца». Супрацоўнікі Глыбоцкага гісторыка-этнаграфічнага музея правялі для ўдзельнікаў мерапрыемства экскурсію па найбольш цікавых гістарычных месцах Глыбокага.

Сёлета да канца года матэрыялы канферэнцыі плануецца надрукаваць асобным выданнем, з якім змогуць пазнаёміцца ўсе, хто цікавіцца гісторыяй Глыбоччыны і краіны.

*Паводле публікацыі ў газеце «Веснік Глыбоччыны»*



**Сябры! Падпісацца на «Краязнаўчую газету» можна да 25 чысла любога месяца. Кожны падпісчык – голас у падтрымку краязнаўства. Будзьма разам!**

# Адна, і іншай – не будзе

**Першыя пачуцці грамадзянскасці і патрыятызму – ці даступныя яны дзецям? Выходзячы з досведу працы Карэліцкай дзіцячай школы мастацтваў у гэтым кірунку, можна даць сцвярджальны адказ: школьнікам, асабліва малодшага ўзросту, даступнае пачуццё любві да роднага краю, роднай прыроды, да Радзімы.**

Выхаванне пачуцця патрыятызму ў школьнікаў – працэс складаны і працяглы. Любоў да блізкіх людзей, да роднага краю і роднай краіны маюць велізарную ролю ў станаўленні асобы дзіцяці.

Так, навучэнцы і настаўнікі нашай школы з'яўляюцца самымі актыўнымі ўдзельнікамі і арганізатарамі розных патрыятычных акцыяў і марафонаў. Упадабанымі для навучэнцаў і гасцей нашай школы сталі дзіцячая патрыятычная пляцоўка «УСЁ ГЭТА БЕЛАРУСЬ!», інтэрактыўная пляцоўка «ШЧАСЛІВЫЯ ДЗЕЦІ – ШЧАСЛІВАЯ БЕЛАРУСЬ!». Толькі ў гэтым навучальным годзе праведзеныя патрыятычная акцыя «Я вырас тут, і край мне гэты дарагі», выстава навучэнцаў мастацкага аддзялення «Краіна, якой ганаруся», арганізаваны і праведзены пленэр «Малой Радзіме прысвячаю...». Вучні мастацкага аддзялення ў верасні прынялі актыўны ўдзел у Рэспубліканскім конкурсе дзіцячага малюнка «ЗА Беларусь» і раённым конкурсе «Беларусь у маім акне». Дарэчы, настаўнікі школы Святлана Моніч і Анастасія Чычкан адным і з першых адгукнуліся на праект і прадставілі ў сацыяльных сетках відэаролікі са сваімі аўтарскімі творамі.

Патрыятызм – пачуццё, якое мае адносіны як да дзяцей, так і да дарослых. А каб па-сапраўднаму любіць БЕЛАРУСЬ, трэба ведаць яе гісторыю, звычаі, традыцыі. Радзіму трэба берагчы, клапаціцца пра яе, удасканальвацца і развівацца разам з ёю, бо ў кожнага яна адна, і іншай – не будзе.

*Сняжана КАЛЯДА,*
*дырэктар Карэліцкай дзіцячай школы мастацтваў*




# Каб музей прыцягваў наведнікаў

***Як прывесці людзей у музей? Гэтае ды іншыя пытанні мусіць вырашыць праект Хойніцкага раённага краязнаўчага музея «Захаванне і папулярызацыя агульнай культурнай спадчыны праз музейную дзейнасць». Ён будзе рэалізоўвацца сумесна з Асацыяцыяй мясцовых органаў самакіравання Еўрарэгіёну Буг (Люблінскае ваяводства, Польшча) у рамках Праграмы транспамежнага супрацоўніцтва «Польшча – Беларусь – Украіна». Працягласць рэалізацыі праекта – 8 месяцаў, агульны бюджэт – больш за 42 тыс. еўра.***

У рамках рэалізацыі праекта плануецца правядзенне разнастайных канферэнцыяў, семінараў-практыкумаў, сустрэчаў з польскім бокам для абмену досведам па паляпшэнні музейнай дзейнасці, набыццё неабходнага абсталявання, спадарожных тавараў, рэкламнай кампаніі (друк буклетаў, банераў, даведнікаў на трох мовах).

Нядаўна ў Хойніках адбылося першае мерапрыемства – канферэнцыя «Захаванне і папулярызацыя агульнай культурнай спадчыны праз музейную дзейнасць». Удзел бралі з беларускага боку прадстаўнікі райвыканкама, музеяў Хойнікаў, Веткі, Брагіна, Лоева, настаўнікі гісторыі школ Хойніччыны, з польскага – дыпламаты, прадстаўнікі мясцовых органаў самакіравання Еўрарэгіёну Буг, прадстаўнікі музеяў. Удзельнікі падзяліліся досведам працы па захаванні гісторыка-культурнай спадчыны рэгіёну, абмяркоўвалі, як і чым прыцягнуць наведнікаў. Адзінадушныя выступоўцы: у сучасных умовах неабходна перагледзець формы і метады працы музеяў, каб зрабіць іх больш прыцягальнымі для наведнікаў розных узростаў. Нельга не забывацца пры гэтым аб сапраўдным прызначэнні музеяў – гэта не столькі забаўляльная функцыя, колькі адукацыйная, яна падвышае свядомасць грамадзянаў, павялічвае іх веды аб родным краі. Бо гісторыю, да якой можна дакрануцца, здольныя перадаць толькі музеі. І гэты, галоўны, напрамак патрэбна захоўваць.

*Вольга БЕЛАШ*
*Паводле публікацыі на сайце газеты «Хойніцкія навіны»*

# На тым тыдні...

## *Ратуемся спадчынай*

✓**7 кастрычніка** ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь адбылася прэзентацыя электроннага дакументальнага выдання **«Сводки и спецсообщения руководящих органов партизанского движения в Беларуси: 1942 год»** (серыя «Партизанский архив»), падрыхтаванага ў рамках сумеснага праекта Нацыянальнага архіва і Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і прымеркаванага да 75-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. У выданне ўвайшлі лічбавыя копіі аператыўных зводак Паўночна-Заходняй групы пры ЦК КП(б)Б і СНК БССР, інфармацыйных зводак ЦК КП(б)Б, аператыўных і разведвальных зводак Беларускага штаба партызанскага руху ды інш. структураў. У мерапрыемстве бралі ўдзел загадчык аддзела публікацыяў архіва, кандыдат гістарычных навук Святаслаў Кулінок, намеснік генеральнага дырэктара бібліятэкі Алесь Суша, архівісты, гісторыкі.

✓Музей гісторыі горада Мінска і LIBRA **10 кастрычніка** запрасілі ў Мастацкую галерэю Міхаіла Савіцкага на выставачны праект **«Сальвадор Дали. Тайнопись»**. Дэманструюцца 61 графічны твор знакамітага майстра. Гэта арыгінальныя каляровыя графічныя творы з прыватных збораў і галерэяў Еўропы і Амерыкі. Прадстаўленыя таксама працы вядомых беларускіх мастакоў і пачаткоўцаў, якія натхняліся на стварэнне творчасцю Далі, блізкія стылем да вядомага сюрэаліста. Выстаўленая і жывапісная праца 14-гадовага Максіма Лагуна.

Пабачыць айчынны і заходнееўрапейскі сюррэалізм можна па 20 снежня.

✓**13 кастрычніка** ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь адкрылі выставу **«Археалагічны помнік: фіксацыя мінулага ў мінулым»**, створаную ў межах музейнага праекта «Мінулае мае будучыню: дыялог культуры і навукі». Выстава ставіць перад сабой задачу прыцягнуць увагу грамадскасці да захавання гісторыка-культурнай спадчыны краіны. Адной з тэматычных ліній выставы з'яўляецца гісторыя станаўлення айчыннай археалогіі як навукі, якое адбылося ў 1920 – 1930-х гг. Цягам ста гадоў айчынная археалагічная навука старанна працуе на карысць краіны, але яе героі часта застаюцца ў цені. Выстава выпраўляе гэтую несправядлівасць. Імёны гігантаў айчыннай археалагічнай навукі прадстаўленыя шырокай грамадскасці праз фотаздымкі і знаходкі з экспедыцыяў першай паловы XX ст. Асаблівую цікавасць выклікаюць побытавыя фотаздымкі з археалагічных экспедыцыяў тых часоў: як гатавалі ежу, як спалі ў паўзямлянках, як сплаўляліся на лодках па рацэ...

Археалагічныя помнікі цікавілі не толькі даследчыкаў, але і мастакоў: на выставе дэманструюцца арыгіналы і копіі графічных замалёвак Язэпа Драздовіча: замалёўкі стратыграфій, помнікаў і нават рэканструкцыі. Упершыню дэманструецца ўнікальная археалагічная калекцыя мастака.

Выстава ажыццяўляецца сумесна з Нацыянальным мастацкім музеем Рэспублікі Беларусь, Беларускім дзяржаўным архівам кінафотафонадакументаў, Беларускім дзяржаўным архівам навукова-тэхнічнай дакументацыі, Слонімскім раённым краязнаўчым музеем імя І.І. Стаброўскага, Цэнтральнай навуковай бібліятэкай імя Якуба Коласа НАН Беларусі, Інстытутам гісторыі НАН Беларусі, гістарычным факультэтам Белдзяржуніверсітэта і іншымі.

✓**13 кастрычніка** Польскі інстытут у Мінску і кнігарня «Логвінаў» запрасілі на чарговую літаратурную сустрэчу з цыкла **«Санаторый пад клепсідрай»**. Паэт і перакладчык Андрэй Хадановіч распавёў пра знакамітага польскага лірыка, сатырыка-фрашкапісца, празаіка і вядомага афарыста Станіслава Ежы Леца (1909 – 1966).

✓**14 кастрычніка** ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы прайшла вечарына **«Беларускія красуні»**, якую ў Дзень маці зладзілі пісьменніца-казачніца Алена Масла і арт-студыя «Казка». Удзел бралі супрацоўніцы Купалавага дома, пісьменніцы Наталля Бучынская, Аксана Спрынчан (з дачкой Альжбетай) і Надзея Ясмінская, спявалі Маруся і Жэня Грыні, Адэлька Малышчыц, граў казачны музыка Яраш Малішэўскі.

На вечарыне ладзіўся вернісаж партрэтаў матуляў, а таксама майстар-клас для дзяцей.

✓У Гарадской мастацкай галерэі твораў Л. Шчамялёва **14 кастрычніка** адкрылі выставу **«Открытые сердца»** дзіцячай творчасці выяўленчай студыі «Фарбы» Ждановіцкай спецыяльнай агульнаадукацыйнай школы-інтэрната, прымеркаваную да Дня маці. Прадстаўленыя больш за 40 працаў дзяцей 13 – 18 гадоў. Пабачыць іх можна па 22 лістапада.

✓**15 кастрычніка** ў Арт-гасцёўні «Высокае мѣста» пачала працу выстава **«LITHO graphics exlibris»** Вольгі Крупянковай і Таццяны Сіплевіч, прымеркаваная да іх 50-годдзя.

Яны разам вучыліся ў Мінскім дзяржаўным мастацкім каледжы імя А. Глебава, потым у Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў; іх звязваюць сяброўскія стасункі, творчае супрацоўніцтва і ўзаемападтрымка, а таксама шматлікія сумесныя выставачныя праекты, удзел у міжнародных кангрэсах і выставах экслібрыса. Яны сябры Беларускага саюза мастакоў, лаўрэаты шматлікіх міжнародных выставаў-конкурсаў, міжнародных кангрэсаў экслібрыса.

Экспазіцыя змяшчае прыкладна 140 літаграфіяў, сюжэты ўражваюць сваёй складанасцю і багаццем тэматыкі, даюць магчымасць пазнаёміцца з міфалогіяй розных народаў, па-новаму паглядзець на біблейскія тэмы, пагружаюць у свет дзіцячай казкі.

Выстава працягнецца да 8 лістапада.

*Скарыстаная інфармацыя з паведамленняў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, Музея гісторыі горада Мінска, Польскага інстытута ў Мінску, Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь, Алены Масла.*

# Найлепшыя даследчыкі сямейных фотаальбомаў

ІІ гістарычны конкурс для моладзі
ПА-ЗА КАДРАМ:
ад гісторыі сям'і да гісторыі супольнасці

***Увесну скончыўся другі конкурс па гісторыі для моладзі «Па-за кадрам: ад гісторыі сям'і да гісторыі супольнасці» (ладзіцца ў рамках праекта «Конкурсы па гісторыі ў Беларусі, Грузіі, Малдове і Украіне 2.0»), што праводзяць Прадстаўніцтва DVV International у Беларусі і Моладзевае грамадскае аб'яднанне «Гісторыка».***

Сёлета была вытрыманая доўгая паўза інтрыгі: хто атрымаў перамогу? Звязанае тое было з неспрыяльнаю сітуацыяй з каранавірусам. Арганізатары спадзяваліся, што ўдасца правесці цырымонію абвяшчэння і ўзнагароджання пераможцаў ужывую. На жаль, усё ж давялося скарыстацца сучаснымі тэхналогіямі, дзе ўдзельнікі, арганізатары і журы пабачылі адно аднаго толькі на маніторах камп'ютараў і экранах смартфонаў ды планшэтаў.

У мінскім офісе DVV сабраліся арганізатары і журы, каб падзяліцца ўражаннямі ад эсэ ўдзельнікаў, выказаць свае прапановы на будучыню. І вядома ж, агучыць імёны пераможцаў. Варта адзначыць,



Таццяна Мастыка і Марына Маленіна

што гэтым разам колькасць працаў большая, чым мінулы раз, таксама стала больш удзельнікаў з малых гарадоў і невялікіх вёсак. Праўда, на жаль, меней сачыненняў, напісаных на беларускай мове.

Напачатку сустрэчы з прывітальнымі словамі выступілі каардынатар праекта «Конкурсы па гісторыі ў Беларусі, Грузіі, Малдове і Украіне 2.0» Андрэй Ферт (Украіна), праграмны дырэктар сеткі «EUSTORY», «Körber Foundation», Каця Фаўзер (ФРГ), кіраўнік напрамку «Публічная гісторыя» Еўрапейскага каледжа «Liberal Arts у Беларусі» (ECLAB) Аляксей Братачкін (Беларусь) і Таццяна Мастыка з МГА «Гісторыка». Яны прывіталі ўдзельнікаў і пераможцаў, адначылі актыўнасць школьнікаў і моладзі Беларусі, якасць напісаных эсэ і выказалі ўпэўненасць, што час і намаганні, патрачаныя моладдзю на пошук інфармацыі і напісанне працаў, сталі ім карысныя і прыдадуцца надалей. Потым пагаварылі аб досведзе правядзення гістарычных конкурсаў. Загадчыца кафедры гісторыі і палітыкі, прадстаўнік «Körber Foundation» Габрыэла Вайдэлка і праграмны менеджар сеткі «EUSTORY» Інка Сіут распавялі аб гістарычных конкурсах у Германіі, аб конкурсе 2019 – 2020 гг. у Беларусі распавяла менеджар праекта прадстаўніцтва DVVI ў Беларусі Алена Шандрак. Пасля гэтага асабістымі ўражаннямі ад конкурсу падзяліліся некаторыя ўдзельнікі і куратары, сябры журы. Аўтар гэтых радкоў выказаў упэўненасць, што кожны ўдзельнік (нягледзячы, адзначаны ён журы ці не) – пераможца, бо за час напісання эсэ кожны перагарнуў сямейныя фотаальбомы, больш даведаўся пра свае род і родны край. «Спадзяюся, вы і па-за межамі конкурсу працягнеце вывучэнне свайго радаводу, што, без сумневу, яшчэ не раз спатрэбіцца ў жыцці».

Далей пачалася самая хвалюючая і ўрачыстая частка – абвяшчэнне пераможцаў.



Андрэа Хутэрэр і Уладзімір Парфянок

Журы разглядала працы ў дзвюх узроставых катэгорыях: школьнікі і студэнты, маладыя спецыялісты (падзеленая на групы «гісторыкі» і «не гісторыкі»).

Сярод школьнікаў 1 месца атрымала Аліна Міранюк, 9-класніца СШ № 1 імя В. Галаўко г. Бярозы за эсэ «Со страниц армейского альбома...» (куратар Галіна Руціч); 2 месца занялі Аляксандра Сядзько, 10-класніца Лоеўскай СШ імя А. Казлова, эсэ «Мы хотели выглядеть хорошо...» (куратар Людміла Сямашка), Ганна Талкун, Анастасія Талкун, 9-класніцы гімназіі № 1 г. Дзятлава, эсэ «Советская эпоха в зеркале свадебной фотографии» (куратар Алена Радомская); 3 месца занялі Вікторыя Буяліч, 11-класніца Навасёлкаўскай СШ Пастаўскага раёна, эсэ «У Божай міласці, у людской шчырасці будзе доўжыцца мой радавод» (куратар Алена Вішнеўская), Антон Плявака, вучань СШ № 2 г. Ашмяны, эсэ «Формирование домашней библиотеки. Её роль в повседневной жизни семьи» (куратар Інэса Барысевіч), Анастасія Філіновіч, 9-класніца Мотальскай СШ Іванаўскага раёна, эсэ «Руссо туристо! Облико морале!» (куратар Вольга Райкевіч).

Шэраг працаў таксама адзначаныя спецыяльнымі намінацыямі. Эсэ Аляксандра Ананькі «Каваль з хутара Загрэбля» (Русіноўская СШ Баранавіцкага раёна, куратар А. Кісялёва) адзначанае ў намінацыі «Чалавек незвычайнага лёсу»; эсэ Дар'і Аўсюк «Сталіца там, дзе ты жывеш!» (аб'яднанне па інтарэсах «Краязнаўства» пры Сар'янскім дзіцячым садзе – базавай школе Верхнядзвінскага раёна, куратар Дзяніс Казлоў) – «За літаратурны стыль»; эсэ Марыі Цішкевіч і Анастасіі Хралянковай «По волнам нашей памяти» (гімназія № 1 г. Горкі, куратар Алена Казлова) – «Фотарасследаванне»; эсэ Ганны Вінцаловіч «Еще раз про любовь... (Женская история)» (СШ № 2 г. Ашмяны, куратар Інэса Барысевіч) – «За беражлівае стаўленне да герояў і гераіняў»; эсэ Кацярыны Гук «Три моста одной реки» (Белавежская СШ Камянецкага раёна, куратар Людміла Гурыновіч) – «За рэканструкцыю гісторыі мясцовай супольнасці»; эсэ Уляны Косцінай «Дневник памяти» (Магілёўская гарадская гімназія № 1, куратар Наталля Вішаватая) – «За арыгінальную форму эсэ»; эсэ Наталлі Масалковай «Заслоновская республика» (гімназія № 1 г. Оршы, куратар Тамара Гайдук) – «За цікавасць і беражлівае стаўленне да мясцовай гісторыі»; эсэ «Чёрная туча Чернобыля» Паліны Міхайлавай (СШ № 34 г. Віцебска) – «За вывучэнне актуальнай тэмы праз прызму сямейных успамінаў»; эсэ «Дорога к Жировичской святыне» Юліі Равінскай (Жыровіцкая СШ Слонімскага раёна, куратар Алена Бякрэнь) – «Найлепшая творчая праца/фільм); намінацыя «Дэтальны аналіз фота» – за эсэ «Семейные фотографии – часть истории страны» 11-класніцы Таццяны Бубен (СШ № 1 г. Скідзеля, куратар Наталля Чаркес).

Сярод студэнтаў і маладых спецыялістаў (не гісторыкаў) 1 месца атрымала Яўгенія Ахоціна за эсэ «Вёска, якой няма» (ААТ «Вебмарт Групп», куратар Тарэса Кудрык); 2-е – Вераніка Астроўская за эсэ «Витебское "Узгор'е": возрождение культуры» (студэнтка Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, факультэт філасофіі і сацыяльных навук, куратары Ларыса Цімошчанка, Таццяна Дробыш); 3-е – Карына Мядзелец за эсэ «І нараджае вера дабрыню» (студэнтка Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта, факультэт фінансаў і банкаўскай справы, куратар Іна Пучынская).

Гісторыкаў сёлета ў катэгорыі «студэнты і маладыя спецыялісты» было няшмат, сярод іх журы месцы не прысудзіла. У намінацыі «За найлепшае візуальнае прадстаўленне вуснай гісторыі» ўзнагароджаны настаўнік гісторыі Сар'янскага дзіцячага сада – базавай школы Верхнядзвінскага раёна Дзяніс Казлоў за эсэ «Мне повезло родится с другом».

Апроч гэтага сярод негісторыкаў у намінацыях адзначаныя: Анастасія Антуновіч, эсэ «Усё пачынаецца з любові...» (Полацкі дзяржаўны медыцынскі каледж імя Героя Савецкага Саюза З. Тусналобавай-Марчанкі, куратар Валянціна Мілаш) – «За беражлівае стаўленне да сямейнай гісторыі»; Аліна Леснічэнка, эсэ «Надя-Надежда» (Мінскі фінансава-эканамічны каледж, куратар Вольга Басарымава) – «За літаратурны стыль»; Аляксандра Гушча, эсэ «Апошні шлях. Жыццё да і пасля» (работнік Столінскай раённай бібліятэчнай сістэмы, куратар Ірына Машлякевіч) – «За глыбокую рэфлексію і зварот да рэдкага жанру фота».

Апроч гэтага, некалькі працаў адзначылі і члены журы. Спецнамінацыю «Нагляднае адлюстраванне аспекта савецкай эпохі на аснове індывідуальных лёсаў» ад Андрэа Хутэрэр атрымала Ірына Раўко, 9-класніца Парэцкай СШ Гродзенскага раёна (куратар Наталля Даніловіч) за эсэ «Рамантыкі вялікай магістралі»; намінацыя «Героі новага часу» ад Уладзіміра Парфянка – за эсэ «Ты только день тем жил, ходил и даже спал с гитарой...» Артура Раку (СШ № 2 г.п. Рось, куратар Лілія Раку).

Дзве працы адзначаныя ад імя Беларускага фонду культуры і «Краязнаўчай газеты». Дар'я Галавач, вучаніца гімназіі № 1 г. Ваўкавыска, адзначаная ў намінацыі «Мой род – мая Радзіма» за эсэ «Адно жыццё ў гісторыі малой Радзімы» (куратар Яніна Бандык); Паліна Барысік, студэнтка Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта, адзначаная ў намінацыі «Будзем памятаць мы...» за эсэ «Малая радзіма: дзядоў і продкаў нашых дух не сцёрся на парозе» (куратар Людміла Барысік).

***Паводле дамоўленасці з арганізатарамі конкурсу наша газета будзе друкаваць некаторыя працы (прычым, не толькі адзначаныя ўзнагародамі). Першая – ужо ў наступным нумары!***

*Уладзімір ПУЧЫНСКІ,*
*сябра журы конкурсу «Па-за кадрам: ад гісторыі сям'і да гісторыі супольнасці»*
*Фота аўтара і арганізатараў цырымоніі*



Узнагароды ад БФК і «КГ»

# Турыстычны патэнцыял сядзібных ансамбляў Гомельскага Пасожжа

*Даклад Дар'і Кухарэнка, вучаніцы 11 класа СШ № 66 г. Гомеля*




У наш час адзначаецца павышаная цікавасць да гісторыі старадаўніх селішчаў, да адпачынку ў сядзібах – помніках архітэктуры, знаёмства з традыцыямі, ладам жыцця і вытворчымі стасункамі вышэйшых пластоў грамадства мінулых стагоддзяў. Такія туры фармуюць асобны кірунак турыстычнай дзейнасці культурна-спазнавальнага характару – сядзібны турызм.

У Гомельскай вобласці своеасаблівы ландшафт спалучаецца з гісторыка-культурнымі помнікамі, што ствараюць унікальную магчымасць для развіцця такога кірунку турызму. Сядзібныя ансамблі ўпрыгожваюць узгоркі, берагі рэк і азёраў, надаючы ім веліч і высакароднасць. Яны з'яўляліся цэнтрамі не толькі культурнага жыцця, але і развіцця прамысловасці ў рэгіёне (пры іх былі створаныя бровары, першыя фабрыкі і заводы, цэнтры гандлю). Сядзібны турызм спрыяе захаванню гісторыі і традыцыяў гэтых месцаў, адраджэнню промыслаў. Гэта і абгрунтоўвае актуальнасць тэмы нашага даследавання.

**Мэта працы** – папулярызацыя геаграфіі і гісторыі свайго краю праз знаёмства са старадаўнімі сядзібнымі ансамблямі, дзейнасцю іх уладальнікаў і створанымі культурнымі ландшафтамі.

На Гомельшчыне шматлікія сядзібы з'яўляліся культурнымі і эканамічнымі ўтварэннямі, што адпавядалі агульнаеўрапейскім традыцыям і захоўвалі нацыянальныя асаблівасці. Сядзібамі валодалі такія вядомыя роды, як Аскеркі, Халецкія, Дзерналовічы, Хмыжоўскія, Юдзіцкія, Яленскія, Кяневічы і інш. («Рэгіёны Беларусі. В 7 томах. Том 3. Кніга 2. Гомельская вобласць», 2013). Сёння захавалася больш за 30 сядзібаў, але большасць з іх патрабуе правядзення рэстаўрацыі.

Дзеля развіцця сядзібнага турызму ў Гомельскай вобласці намі распрацаваны турыстычны праект «Старадаўнія сядзібныя комплексы Гомельскай вобласці», куды ўключаныя тры экскурсійна-спазнаваўчыя маршруты: «Старадаўнія сядзібныя комплексы Гомельскага Палесся», «Старадаўнія сядзібныя комплексы паўночных раёнаў Гомельскай вобласці» і «Старадаўнія сядзібныя комплексы Гомельскага Пасожжа».

Маршрут складаецца з шасці аб'ектаў: сядзібна-паркавы комплекс «Багуслаўскі фальварак» (г. Гомель), сядзіба Халецкіх (в. Хальч, Веткаўскі раён), жылы дом Цімафея Грошыкава (г. Ветка), сядзібна-прамысловы комплекс Добрушскай папяровай фабрыкі (г. Добруш), Купецкі дом (в. Агародня-Гомельская, Добрушскі раён), Паляўнічы дамок у мястэчку Каранёўка Гомельскага раёна.

Распрацаваны маршрут уключае як вядомыя турыстычныя аб'екты (напрыклад, сядзіба Халецкіх), так і тыя, пра якія ўспамінаюць рэдка (Купецкі дом, Багуслаўскі фальварак). На некаторыя з іх мы прапануем паглядзець як на цэнтры старадаўніх гандлёва-прамысловых комплексаў (г. Ветка і г. Добруш). Іх аб'ядноўвае першапачатковае прызначэнне, самабытная культура, своеасаблівая архітэктура і геаграфічнае становішча.

Намі праведзеная ацэнка турыстычнай прывабнасці аб'ектаў маршруту. Яна дазволіла вызначыць каштоўнасць і важнасць асобных турыстычных рэсурсаў і іх комплексаў. Праведзенае даследаванне выявіла моцныя і слабыя бакі галіны, на падставе чаго магчыма распрацаваць найбольш эфектыўныя механізмы павышэння ўзроўню прывабнасці рэгіёну.

Для разліку агульнага паказчыка па аб'ектах улічваліся рэйтынгі прывабнасці па наступных крытэрыях: гістарычная каштоўнасць сядзібы, архітэктурная каштоўнасць, мемарыяльная каштоўнасць, вядомасць аб'екта, наяўнасць музейнага фонду, захаванасць аб'екта, ландшафтна-прыродная каштоўнасць, наяўнасць турыстычнай інфраструктуры, транспартная даступнасць, эстэтычная прывабнасць ансамбля, сучаснае выкарыстанне. Ацэнка кожнага крытэрыю праводзілася па пяцібальнай шкале. Вынікі дазволілі ранжыраваць аб'екты па сумарным бале турыстычнай прывабнасці.

Гістарычная каштоўнасць сядзібы адлюстроўвае ў сабе час пабудовы. Чым старэйшы аб'ект, тым большы бал яму прысвойваецца. Усе сядзібы, што ўваходзяць у распрацаваны маршрут, датуюцца XIX стагоддзем.

Асноўным паказчыкам архітэктурнай каштоўнасці з'яўляецца наяўнасць архітэктурнага стылю. Сярод пабудоваў сустракаюцца розныя стылі: позні класіцызм (сядзіба Халецкіх), неаготыка (дом Цімафея Грошыкава, комплекс Добрушскай папяровай фабрыкі), сельскага барока (Купецкі дом), прысутнічаюць элементы рамантычнага стылю (Багуслаўскі фальварак). У будаўніцтве Дома Грошыкава прымалі ўдзел вядомыя італьянскія архітэктары, Паляўнічага дамка – архітэктары з Пецярбурга.

Сядзібы адлюстроўваюць гісторыю важных гістарычных падзеяў у маштабах горада, рэгіёну і краіны. Самы высокі бал па крытэрыі «мемарыяльная каштоўнасць» мае сядзібны комплекс Добрушскай папяровай фабрыкі, стварэнне і існаванне якой мела даволі высокі ўзровень значнасці для эканомікі краіны.

На нацыянальным узроўні вядомыя сядзіба Халецкіх, жылы дом Цімафея Грошыкава (дзякуючы таму, што ў ім размяшчаецца цэнтр стараверскай культуры), комплекс Добрушскай папяровай фабрыкі (як найстарэйшы цэнтр папяровай прамысловасці).

Арыгінальныя музейныя экспазіцыі сабраныя ў доме Цімафея Грошыкава (г. Ветка), экспазіцыі краязнаўчага характару прадстаўленыя ў сядзібным ансамблі г. Добруша, музей вытворчай дзейнасці сядзібы знаходзіцца на тэрыторыі Багуслаўскага фальварка.

На рэстаўрацыі ў наш час знаходзяцца сядзіба Халецкіх і Купецкі дом. Астатнія аб'екты аднаўленыя і выкарыстоўваюцца ў турыстычнай і вытворча-турыстычнай дзейнасці.

Часткова захаваліся паркі вакол сядзібы Халецкіх і Паляўнічага дамка, фрагменты фруктовага саду ў Багуслаўскім фальварку.

Турыстычная інфраструктура развітая ў Гомелі, Ветцы, Добрушы, дзе актыўна вядзецца турыстычная дзейнасць, і аб'екты, што ўваходзяць у распрацаваны маршрут, задзейнічаныя ў ёй.

Такім чынам, найбольшай турыстычнай прывабнасцю валодаюць старадаўнія сядзібныя ансамблі ў Ветцы і Добрушы дзякуючы наяўнасці і ўтрыманню музейных фондаў, развітай турыстычнай інфраструктуры. Уяўляюць цікавасць сядзіба Халецкіх і Паляўнічы дамок. Першая несумненна павялічыць свой рэйтынг пасля правядзення поўнай рэканструкцыі. Перспектыўнымі турыстычнымі аб'ектамі з'яўляюцца Багуслаўскі фальварак і Купецкі дом. Гэтым аб'ектам патрабуецца большае ўкараненне ў турыстычную сферу, прыцягненне ўвагі турыстаў і распрацоўка цікавых экскурсіяў, выставаў, экспазіцыяў, майстар-класаў і інш.

Для вывучэння турыстычнага попыту на прадстаўлены маршрут скарыстаны метад анкетавання. Апытанні па распрацаванай анкеце праведзеныя сярод вучняў школы № 66 г. Гомеля, настаўнікаў гэтай школы і жыхароў гарадскога мікрараёна «Клёнкаўскі». Усяго апрацавана 140 анкетаў. Сядзібны турызм у большай ступені выклікае цікавасць сярод дарослага насельніцтва. Пры гэтым школьнікі лепш ведаюць сядзібныя ансамблі сваёй мясцовасці. Самым наведвальным аб'ектам з прапанаванага спіса з'яўляецца Паляўнічы дамок у в. Каранёўка. Усе ўдзельнікі апытання наведвалі палацава-паркавы ансамбль у Гомелі, аднак толькі 20 % з іх былі ў сядзібе, і гэта ў большасці школьнікі.

У час праведзенага даследавання былі выяўленыя пазітыўныя аспекты і стрымальныя фактары, што ўплываюць на рэалізацыю патэнцыялу сядзібнага турызму і дазваляюць вызначыць кірункі яго далейшага развіцця на тэрыторыі Гомельскай вобласці. У сучасных умовах эфектыўнаму развіццю і паўнавартаснай рэалізацыі прыроднага патэнцыялу і культурна-гістарычных рэсурсаў тэрыторый спрыяе фармаванне сядзібных ансамбляў, прыдатных для выкарыстання з мэтай адпачынку і азнаямлення з гісторыяй, культурай і традыцыямі рэгіёну.

Асноўная праблема развіцця сядзібнага турызму ў Гомельскай вобласці і ў краіне ў цэлым, апроч разбуранага стану большасці сядзібаў, – гэта дэфіцыт дзяржаўнай увагі і фінансавання ў галіне аховы і аднаўлення сядзібных ансамбляў. Магчымыя шляхі рашэння праблемаў развіцця сядзібнага турызму – гэта аналіз сядзібнай спадчыны рэгіёну і стварэнне інфармацыйнай базы па сядзібах, маніторынг іх стану, стварэнне мэтавай праграмы па аднаўленні і папулярызацыі сядзібаў як турыстычнага рэсурсу, прыцягненне пазабюджэтных сродкаў і інвестыцыяў, развіццё турыстычнай інфраструктуры вакол сядзібных ансамбляў.

Гомельская вобласць уваходзіць у лік рэгіёнаў з традыцыйна развітым турыстычным сектарам. Разам з тым яна валодае шматлікімі перспектыўнымі магчымасцямі развіцця турызму. Стратэгічнай задачай з'яўляецца прыцягненне турысцкіх патокаў шляхам стварэння новых запатрабаваных турыстычных прадуктаў, у тым ліку сядзібных тураў, забеспячэння ўмоваў для з'яўлення новых турыстычных накірункаў. Попыт на сядзібны турызм дазваляе пашырыць спіс наяўных прапановаў і працаваць у гэтым накірунку.


«Багуслаўскі фальварак»


Паляўнічы дамок

# Сядзіба Святаполк-Чацвярцінскіх у Жалудку як прыклад негатыўнага стаўлення да аховы гісторыка-культурнай спадчыны

*Даклад Уладзіслава Рудакова, магістранта БДУКіМ, супрацоўніка Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту*

***Сядзібна-паркавыя комплексы – найбольш выразныя і каштоўныя аб'екты матэрыяльнай нерухомай гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі. Яны адлюстроўваюць побыт заможнага насельніцтва Беларусі ў пэўны час, з'яўляюцца сведкамі гістарычных падзеяў, развіцця айчыннай культуры і мастацтва. Таму, безумоўна, маюць патрэбу ў захаванні.***

Толькі на Гродзеншчыне да сённяшняга дня ў той ці іншай ступені захавалася больш за 370 помнікаў сядзібна-паркавай і палацавай архітэктуры. Большая частка з іх знаходзіцца ў занядбаным стане і патрабуе аднаўлення. Выйсцем можа быць продаж сядзібаў у прыватную ўласнасць, і апошнія 10 гадоў такі варыянт актыўна выкарыстоўваецца дзяржавай. Здавалася б, гэта ідэальны варыянт: дзяржава атрымоўвае грошы і цалкам кантралюе працэс аднаўлення помнікаў, якое выконвае прыватная асоба для далейшага выкарыстання ў асабістых мэтах. Але не заўсёды ўладальнікі адказна ставяцца да такой праблемнай нерухомасці. Аднаўленне помнікаў патрабуе вялікіх грошай, шматлікіх узгадненняў з Міністэрствам культуры – гэта доўгі і складаны працэс, які ў выніку становіцца нецікавым для новых уладальнікаў. Прыкладам можа паслужыць сітуацыя з сядзібна-паркавым комплексам Святаполк-Чацвярцінскіх – гісторыка-культурнай каштоўнасцю 2 катэгорыі, што знаходзіцца ў г.п. Жалудок Шчучынскага раёна.

З пачатку XVIII ст. Жалудком валодалі прадстаўнікі роду Тызенгаўзаў, шэсць пакаленняў вялі тут сваю гаспадарку. Да гэтага часу Жалудок належаў і іншым фаміліям, але менавіта Тызенгаўзы сталі першымі, хто стала абжыўся на гэтым месцы. У 1835 г. дачка Рудольфа Тызенгаўза Германцыя выйшла замуж за Северына Урускага, і землі перайшлі да гэтага роду. Потым дачка Северына і Германцыі Марыя Уруская стала жонкай Уладзіміра Святаполк-Чацвярцінскага, і ў другой палове XIX ст. Жалудок перайшоў да сваіх апошніх уладароў.

Акрамя лясоў, палёў і лугоў, Святаполк-Чацвярцінскія сталі гаспадарамі сядзібна-паркавага комплексу, куды ўваходзілі парк, закладзены ў другой палове XVIII ст., і некаторыя прысядзібныя пабудовы розных часоў. Самы стары будынак – сядзібны дом Тызенгаўзаў XVIII ст., які называюць «замачкам» з-за падабенства да сярэднявечнага гатычнага замка. З пачатку XIX ст. засталіся два класіцыстычныя каменныя флігелі, якія, магчыма, былі пачаткам недабудаванай рэзідэнцыі ў падобным стылі. Але вядома, што да пачатку XX ст. і Тызенгаўзы, і Урускія, і Святаполк-Чацвярцінскія жылі менавіта ў «замачку».

Стары сядзібны дом стаў цесным для сям'і Святаполк-Чацвярцінскіх, таму яны вырашылі пабудаваць новы вялікі палац. У навуковых крыніцах, прысвечаных жалудоцкай сядзібе, беларускія даследчыкі, а таксама польскі аўтар Р. Афтаназі, згадваюць, што палац быў пабудаваны па праекце вядомага польскага архітэктара Уладзіслава Марконі ў 1907 – 1908 гг. Аналагічныя звесткі ёсць у энцыклапедычным зборніку «Архітэктура Беларусі». Аднак у мемуарах Андрэя Раствароўскага, сына вядомага архітэктара Тадэвуша Раствароўскага, я знайшоў цікавыя звесткі – аўтар, пералічваючы рэалізаваныя праекты свайго бацькі, згадвае: «...Жалудок – Чацвярцінскіх, потым па жаданні гаспадароў Марконі няўдала перарабіў яго». Таму, магчыма, першапачатковы палац быў пабудаваны раней і меў зусім іншы выгляд.

Будынак у тым выглядзе, у якім захаваўся да нашых дзён, узведзены ў рысах неабарока. Абодва фасады вылучаюць рызаліты з фігурнымі шатровымі завяршэннямі, парадны ўваход упрыгожвае балкон на чатырох калонах. У дэкоры фасада выкарыстаны і элементы ракако – фігурныя ліштвы, авальныя люкарны, вазы і гірлянды, геральдычная кампазіцыя над уваходным рызалітам. Будынак накрыты мансардавым дахам з невялікімі паўцыркульнымі вокнамі.

Пад час Першай сусветнай вайны палац разрабавалі як нямецкія, так і рускія войскі. Былі страчаныя амаль усе каштоўныя рэчы і творы мастацтва, сабраныя шматлікімі пакаленнямі ўладароў Жалудка. Некаторы час палац выкарыстоўваўся як нямецкі шпіталь. Па вайне Святаполк-Чацвярцінскія выдаткавалі вялікія сродкі на аднаўленне палаца, але да Другой сусветнай будынак так і не быў заселены. Сям'я жыла ў адным з флігеляў, куды перамясцілі астатнюю мэблю і каштоўнасці. Усё гэта таксама было страчана ў верасні 1939 г. Апошні ўладальнік сядзібы Людвіг Святаполк-Чацвярцінскі і яго жонка былі арыштаваныя савецкай уладай. Іх вызвалілі толькі дзякуючы заступніцтву італьянскага караля Віктара Эмануэля. Але лёс князя Людвіга склаўся сумна: праз некаторы час немцы адправілі Святаполк-Чацвярцінскага ў Асвенцым, дзе 3 мая 1941 г. ён загінуў.


Сядзіба Святаполк-Чацвярцінскіх у 1917 г.

Як сядзібу выкарыстоўвалі пасля Другой сусветнай вайны – невядома. З 1960 па 1983 г. яна належала вайсковай часці супрацьпаветранай абароны. Потым тут знаходзіўся склад ваеннай тэхнікі. Пасля таго, як у 1992 г. вайсковая часць была расфармаваная, маёнтак перадалі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, у дэпартамент па сельскай гаспадарцы. Потым сядзібай валодал лідскі завод гарачага цынкавання «Конус». У гэты час тут быў зняты беларускі фільм «Масакра», што значна пашкодзіла палац, бо пад час здымкаў у будынку зладзілі сапраўдны пажар і пафарбавалі сцены.

У чэрвені 2014 г. сядзібу ў Жалудку набыла з аўкцыёну сям'я маскоўскіх бізнесоўцаў Гаўрылавых з мэтай арганізацыі тут буйнога турыстычнага комплексу. Адразу ж было падпісанае ахоўнае абавязацельства. Аднак за амаль што 6 гадоў ніякіх працаў па рэканструкцыі палаца і прысядзібных будынкаў зроблена не было. За гэты час у сядзібе быў адрэмантаваны КПП на ўваходзе, замененыя вароты, некалькі разоў праводзілася чыстка тэрыторыі ад травы і кустоў. Толькі ў пазамінулым годзе быў праведзены аварыйны рамонт даху, пракладзеная сістэма водаадвода ў палацы. Між тым, да 2018 г. турысты маглі бесперашкодна трапляць унутр палаца, аднак, па выніках працы адмысловай камісіі, была зроблена адназначная выснова: знаходзіцца ўнутры пабудовы небяспечна, бо яна ў аварыйным стане. З таго часу ў будынку забілі дзверы, нацягнулі стужку, што забараняе набліжацца да помніка. Райвыканкам падаваў хадайніцтва ў суд, уладальніка сядзібы абавязалі выплаціць штраф у памеры 4-х базавых велічыняў. Гаўрылавы выплацілі штраф, але сітуацыя не змянілася.

Калі райвыканкам чарговы раз падаў дакументы ў пракуратуру, каб прыцягнуць уласніка за невыкананне ахоўных абавязацельстваў, гаспадар паведаміў, што ўладальнікам сядзібы цяпер з'яўляецца яго жонка. Як высветлілася, былы ўладальнік заключыў з жонкай шлюбны дагавор, па якім перадаў ёй права валодання сядзібай. А гэта азначае, што ў далейшым гісторыка-культурная каштоўнасць можа быць перададзеная і трэцяй асобе.

Вярнуць помнік дзяржава не можа – калі ў 2014 г. яго прадавалі, у дагаворы куплі-продажу не былі дэталёва прапісаныя абавязкі новага ўладальніка і абмежаванні па часе ўвядзення сядзібы ў эксплуатацыю, бо здзелка паміж былым і новым уладальнікамі была праведзеная без апавяшчэння мясцовых уладаў. Цяпер справа будзе вырашацца праз суд, райвыканкам паспрабуе вярнуць гісторыка-культурную каштоўнасць і знайсці ёй новага ўладальніка.

Сучасны стан захаванасці сядзібы можна назваць крытычным, бо ўсе будынкі патрабуюць рэканструкцыі. Але найбольшую занепакоенасць выклікае самы каштоўны і рэпрэзентатыўны помнік – палац Святаполк-Чацвярцінскіх. Існуе шмат праблемаў, звязаных з захаванасцю будынка, паспрабуем вылучыць асноўныя з іх.

*Шматлікія трэшчыны па фасадзе*. У некаторых месцах прыкладна да 10 см. Эркер з балконам з заходняга боку будынка амаль «адарваўся» ад асноўнага аб'ёму, трэшчыны раскалолі яго на дзве часткі, трымаецца гэты кавалак сцяны на металічных падпорках. Без прыняцця тэрміновых мераў расколіны могуць прывесці да абвалу сцен.

*Страты тынкоўкі*. У месцах, найбольш схільных да ўздзеяння вільгаці, масава адвальваецца тынкоўка. Гэта прыводзіць да таго, што цагляная мураўка застаецца без пакрыцця. Адсюль вынікае наступная праблема.

*Дэструкцыя цэглы і выветрыванне швоў*. Мураўка, што засталася без пакрыцця, кожны дзень падвяргаецца ўздзеянню ветру, сонца і вады. Наступствамі становіцца выветрыванне швоў, цэглы, а таксама адслойванне і абсыпанне яе паверхні. Пашкоджаная мураўка значна ўплывае на трываласць канструкцыі, таму патрабуе тэрміновай замены.

*Стан даху і кроквеннай сістэмы*. Працяканне даху з'яўляецца найбольш сур'ёзнай праблемай: праз дах вада трапляе ўнутр памяшканняў, бурыць муры, падлогі, перакрыцці. Нягледзячы на тое, што ў жніўні 2018 г. дах праверылі на працёкі, у неабходных месцах залаталі, а таксама апрацавалі кроквы прэпаратамі ад біяразбурэнняў, усе гэтыя меры з'яўляецца часовымі. Патрабуецца больш глабальнае ўмяшанне: замена кроквеннай сістэмы і непасрэдна самой страхі.

***Для таго, каб палац Святаполк-Чацвярцінскіх праз некалькі гадоў не быў незваротна страчаны, усе гэтыя праблемы патрабуюць неадкладнага вырашэння. Паколькі ўладальнік гісторыка-культурнай каштоўнасці не хоча займацца аднаўленнем, трэба намагацца вяртання сядзібы і шукаць новыя варыянты яе адраджэння.***

*Друкуецца з невялікімі скарачэннямі.*


Сучасны стан сядзібы




# «Сем вежаў Навагрудка» ад Мікалая Гайбы

**Нядаўна выйшла ў свет кніга «Сем вежаў Навагрудка». Яе аўтар – дырэктар Дома-музея Адама Міцкевіча Мікалай Гайба. Гэта пятае паўнавартаснае выданне навагрудскага гісторыка, краязнаўцы і музеязнаўцы, якое ўключае 30 гістарычна-краязнаўчых нарысаў пра Навагрудчыну.**



Кніга «Сем вежаў Навагрудка» – частка серыі «Падарожжа па родным краі», заснаванай у 2019 годзе выдавецтвам «Беларусь». Кніга выпушчана па заказе і пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Цвёрдая вокладка, дызайн з нацыянальным каларытам і 127 старонак цікавых звестак пра Навагрудчыну.

*– У якасці назвы выдання была выбрана назва аднаго з артыкулаў, які знаёміць з гісторыяй узнікнення Навагрудскага замка,* – прэзентуе сваю кнігу Мікалай Паўлавіч. – *Інакш і быць не магло. Наш замак, які ўзнік у сярэдзіне XI стагоддзя, стаў сведкам слаўнай гісторыі Навагрудка. А яго рэшткі, якія захаваліся да нашых дзён, з'яўляюцца самай вядомай славутасцю раёна і папулярным месцам наведвання і беларусаў, і замежных турыстаў.*

*«Вельмі пачэсна і ганарова прадстаўляць чытачу кнігу даўно знаёмага мне і паважанага Міколы Гайбы "Сем вежаў Навагрудка". Неаднойчы, збіраючыся ў дарогу ў Навагрудак, імкнучыся пра нешта напісаць, я званіў, пісаў дасведчанаму збіральніку памятак мінуўшчыны. І заўсёды ведаў, што і кансультацыю адпаведную атрымаю, і справу сваю журналісцкую вырашу. І ведаю, што дапамог і дапамагае ён многім»*, – так пачаў прадмову да выдання Алесь Карлюкевіч, беларускі краязнаўца, літаратуразнаўца, журналіст, міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь у 2017 – 2020 гадах.

Сапраўды, ні адзін журналіст пры падрыхтоўцы матэрыялаў гістарычна-краязнаўчай тэматыкі не абыходзіцца без дапамогі адпаведных спецыялістаў. І супрацоўнікі музеяў першыя, каму мы тэлефануем.

*– Большасць нарысаў, што ўвайшлі ў канчатковы варыянт кнігі, у розныя гады былі надрукаваны ў нашай раённай газеце «Новае жыццё»,* – працягвае М. Гайба. – *«Ішлі ў Навагрудак караваны з таварам», «Была ў Навагрудку чыгунка», «Навагрудскія старонкі жыцця Адама Міцкевіча», «За 10 дзён да вайны» і іншыя, у якіх расказваецца пра гісторыю Навагрудчыны, славутасці нашага краю, знакамітых асобаў.*

Праца непасрэдна над выданнем кнігі заняла ў Мікалая Паўлавіча некалькі месяцаў. Патрэбна было не проста адабраць нарысы, але і яшчэ раз іх вычытаць, адкарэкціраваць, а таксама падабраць ілюстрацыі. Іх у кнізе ажно 82 – карты, рэпрадукцыі гістарычных карцінаў, партрэты, фотаздымкі і інш.

*– Звычайна падобныя артыкулы друкуюцца ў зборніках навуковых канферэнцый, спецыялізаваных часопісах, газетах, якія не даступны шырокаму колу людзей. Так як серыя «Падарожжа па родным краі» распаўсюджваецца па кнігарнях усёй Беларусі, то цяпер пра Навагрудчыну змогуць чытаць жыхары розных рэгіёнаў краіны. Зацікавіць кніга і тых навагрудчан, хто хоча паглыбіць веды па гісторыі роднага краю,* – упэўнены аўтар.

Першы свой нарыс Мікалай Паўлавіч падрыхтаваў яшчэ ў 1986 г. Пад час вучобы ў Беларускім дзяржаўным універсітэце надрукавалі яго ў навагрудскай раёнцы. А вось першы навуковы артыкул пад яго аўтарствам выйшаў у 1991 г. На сёння бібліяграфія М. Гайбы ўключае пяць кніг: «Навагрудак: гістарычны нарыс» (Навагрудак, 1992), «Навагрудак: гады і падзеі» (Навагрудак, 1996), «Могілкі і пахаванні ў Навагрудку» (Мінск, 2000), «Сэрцу мілая Айчына: вобраз Радзімы ў жыцці і творчасці Адама Міцкевіча» (Баранавічы, 2011) і «Сем вежаў Навагрудка» (Мінск, 2020). Акрамя гэтага, ён з'яўляецца аўтарам шэрага артыкулаў, надрукаваных у энцыклапедыях, навукова-папулярных зборніках, часопісах, газетах. І спыняцца на гэтым наш зямляк не збіраецца.

*– Выхад у свет уласнай кнігі для любога чалавека – ці то спецыяліста ў пэўнай сферы, ці проста аўтара-аматара – значная падзея. І для мяне таксама,* – падзяліўся напрыканцы М. Гайба. – *У першыя дні адчуваеш пэўную ўзнёсласць, а потым пачынаеш задумвацца, над чым працаваць далей. Добра тое, што гісторыя і культура Навагрудчыны настолькі багатая падзеямі і людзьмі, што матэрыялу можна сабраць яшчэ не на адно выданне. Спадзяюся, у мяне атрымаецца парадаваць чытачоў новай цікавай інфармацыяй.*




*Анастасія ПЯТРОВА,*
*паводле «НЖ»*



Ашмяны

# Гісторыя Ашмяншчыны ў віртуальнай прасторы

***У паўночна-заходняй частцы Беларусі ёсць цудоўная мясціна – Ашмянскі край, багаты на свае гісторыю, культуру, прыродныя помнікі. Многія з іх вядомыя далёка за межамі Ашмянскага раёна: Гальшанскі замак, помнік Францішку Багушэвічу ў Жупранах, пункт Дугі Струвэ Тупішкі, Нявесцін камень і іншыя, а яшчэ шмат малавядомых, але цікавых і значных адметнасцяў і фактаў, звязаных з нашым краем. Пра ўсё гэта можна даведацца, завітаўшы ў Ашмянскую раённую бібліятэку. Кнігі, газеты, часопісы, фатаграфіі, дыскі і іншыя дакументы адлюстроўваюць гістарычнае мінулае і сучаснасць краю. Усяго больш за тры тысячы адзінак. Для зручнасці чытачоў матэрыяламі можна карыстацца ў чытальнай зале, узяць на дом праз абанемент, зрабіць ксеракопію або адсканаваць на электронны носьбіт.***

Цяпер, калі сучасныя тэхналогіі трывала ўвайшлі ў паўсядзённае жыццё, бібліятэка прапануе шырокай чытацкай аўдыторыі інфармацыю пра родны край, ды й па іншых тэмах, праз інтэрнэт. Ужо створана для віртуальных карыстальнікаў электронная база ўласнай генерацыі «Ашмяншчына ў асобах і падзеях», якая складаецца з дзвюх рубрык: «Асобы Ашмяншчыны» і «Падзеі».

У рубрыцы «Асобы Ашмяншчыны» ў алфавітным парадку падаюцца звесткі пра знакамітых людзей краю. Гэта заснавальніца каралеўскай дынастыі Ягелонаў Соф'я Гальшанская; дзяржаўны дзеяч, военачальнік, пісьменнік Крыштаф Дарагастайскі; паэт, публіцыст, даследчык ашмянскага краю Чэслаў Янкоўскі; алімпійскі чэмпіён па гандболе Андрэй Барбашынскі; мясцовы паэт Пётр Шакола і многія іншыя.

Рубрыка «Падзеі» ў храналагічным парадку адлюстроўвае важныя гістарычныя падзеі Ашмяншчыны з часу першага ўпамінання ў летапісах да сённяшняга часу: заснаванне горада Ашмяны, пачатак дзейнасці праваслаўнага храма Уваскрэсення Хрыстовага, касцёла Міхаіла Архангела, утварэнне Ашмянскага раёна, вызваленне Ашмяншчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і іншыя адметныя падзеі.

Для аддаленых карыстальнікаў Ашмянская раённая бібліятэка рэалізуе ўласны краязнаўчы праект «Гэта вам цікава ведаць», створаны ў рамках абласнога праекта «А ці ведаеце вы, што…?». Бібліятэкары запісваюць невялікія відэаролікі (на 3 – 5 хвілінаў) пра цікавыя факты, падзеі, аб'екты Ашмяншчыны і змяшчаюць іх на сайце ўстановы і ў сацыяльных сетках. Так, шырокай чытацкай аўдыторыі цікава было даведацца, што на Ашмяншчыне існуе найстарэйшая школа ў Беларусі – у аграгарадку Баруны, якая бярэ пачатак ад Барунскай базыльянскай школы і ёй сёлета споўнілася 320 гадоў. Многім, нават ашмянцам, было таксама невядома, што ў Жупранскім касцёле ёсць высокая драўляная лава, выкананая ў рэтрагатычным стылі, і якую вяскоўцы называюць Багушэвічавай, бо, паводле ўспамінаў старажылаў, на ёй у час малітоўнай службы часта сядзеў Францішак Багушэвіч. Дзякуючы праекту чытацкая аўдыторыя пазнаёмілася з прыродным помнікам Беларусі Нявесціным каменем, што знаходзіцца ў Навасёлкаўскім сельсавеце і пра які існуе шмат легендаў і паданняў: нібыта, калі дзяўчыне хочацца выйсці замуж, трэба абняць гэты цудадзейны камень, і яе жаданне хутка збудзецца.

У планах бібліятэкараў і надалей адшукваць цікавыя факты і звесткі пра Ашмяншчыну, каб як мага больш людзей пазнаёмілася з гэтым прыгожым, багатым на гістарычныя падзеі рэгіёнам Беларусі.

*Галіна ПАЛУБІНСКАЯ,*
*бібліятэкар аддзела бібліятэчнага маркетынгу*
*Ашмянскай раённай бібліятэкі*

# Памятныя мясціны Першай сусветнай вайны ў Мінску

***(Заканчэнне. Пачатак у № 37 – 38)***

З 20 лютага 1918 г. у гэтым будынку размяшчаўся Народны Сакратарыят БНР на чале з Язэпам Варонкам. Тут была прынятая Першая Устаўная грамата, якая абвясціла Выканкам Рады Усебеларускага з’езда органам вярхоўнай улады краю. 25 лютага германская адміністрацыя забрала будынак на патрэбы сваёй музычнай вайсковай каманды.

Будынак, дзе знаходзілася Беларускае таварыства па аказанні дапамогі пацярпелым ад вайны, цяпер належыць філіялу Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры. Таварыства было заснаванае ў красавіку 1915 г. у Вільні. Праз тры месяцы адкрыўся яго Мінскі аддзел, які аб’яднаў 50 чалавек. У яго склад уваходзілі вядомыя грамадскія і культурныя дзеячы: Ядвігін Ш., яго дачка В. Лявіцкая, Уладзіслаў Галубок, Андрэй Зязюля, В. Фальскі, Зоська Верас, яе маці Э. Сівіцкая. Старшынёй таварыства стаў адвакат В. Чавусаў.

Вайна была цяжкім выпрабаваннем для насельніцтва беларускіх губерняў, але асабліва драматычна яна адбілася на лёсах бежанцаў. Мінскі аддзел усяляк стараўся ім дапамагчы: адкрыў для іх шэсць начлежных прытулкаў, адну платную (якая і размяшчалася ў «Беларускай хатцы») і дзве бясплатныя сталовыя. З лета 1916 г. супрацоўнікі аддзела па замове Агульназемскага саюза наладзілі пашыў адзення для войска. У памяшканні таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны па суботах для бежанцаў нелегальна праводзіліся вечарынкі. Перад іх удзельнікамі некалькі разоў выступаў Максім Багдановіч.



*Будынак, дзе знаходзілася Беларускае таварыства па аказанні дапамогі пацярпелым ад вайны*



*Былы Серафімаўскі шпіталь*

Храм-помнік у гонар Усіх святых і ў памяць аб ахвярах, выратаванню Айчыны нашай паслужылых, размешчаны на рагу вуліц Каліноўскага і Усіхсвяцкай. Рашэнне аб яго будаўніцтве было прынятае на пасяджэнні Сінода Беларускай Праваслаўнай Царквы 29 красавіка 1990 г. 4 чэрвеня 1991 г. адбылося асвячэнне закладнога каменя храма-помніка. У 1996 г. у падмурак храма была закладзеная капсула з памятнай Граматай з заклікам да нашчадкаў. Месца будаўніцтва было абранае не выпадкова: з усходняга боку да храма прымыкаюць Маскоўскія (Усходнія) могілкі, дзе спачываюць многія суайчыннікі, якімі ганарыцца Беларусь. Улетку 2006 г. пачалося будаўніцтва храма-помніка. У 2008 г. зацвердзілі назву храма, якая найбольш поўна адпавядае задуме мемарыяла: «Храм-помнік у гонар Усіх святых і ў памяць аб ахвярах, выратаванню Айчыны нашай паслужылых». У ліпені 2010 г. у крыпце храма адбылася ўрачыстая цырымонія пахавання астанкаў трох невядомых салдатаў: вайны 1812 г., Першай сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў. У перспектыве на базе храма плануецца размясціць архіў, дзе будуць сабраныя звесткі пра беларусаў, якія сталі ахвярамі войнаў, рэпрэсіяў і тэрактаў.

Падводзячы вынікі разгляду памятных месцаў Мінска, звязаных з Першай сусветнай вайной, можна зрабіць наступныя высновы. Гістарычных аб’ектаў, звязаных з гэтай тэматыкай, да нашага часу захавалася мала, а наяўныя – мемарыялізаваныя недастаткова. Гэта можа быць звязана, у прыватнасці, і з тым, што многія з іх адносяцца і да іншых гістарычных падзеяў. Напрыклад, храм-помнік прысвечаны вайне 1812 года і Вялікай Айчыннай вайне, а таксама іншым войнам і канфліктам, у якіх бралі ўдзел беларусы і выхадцы з Беларусі.

У доме, дзе знаходзілася Беларускае таварыства па аказанні дапамогі пацярпелым ад вайны, цяпер размяшчаецца філіял Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры; у доме мінскага губернатара – Рэспубліканская гімназія-каледж пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, на будынку ўсталяваная мемарыяльная дошка ў гонар дзекабрыста М. Мураўёва, які жыў у ім у 1821 – 1822 гг.

У будынку былога Серафімаўскага шпіталя цяпер знаходзіцца Мінскае суворaўскае ваеннае вучылішча. На ім усталяваныя дзве памятныя дошкі. Першая прысвечаная Я. Фабрыцыусу, які ў 1922 – 1923 гг. камандаваў 81-і Мінскімі курсамі камскладу, што знаходзіліся ў будынку. Другая – Е. Алёхіну, які з 1933 г. камандаваў Аб’яднанай беларускай вайсковай школай.

Таксама на слабую ступень мемарыялізацыі памятных месцаў Першай сусветнай вайны маглі паўплываць наступствы польска-савецкай і Вялікай Айчыннай войнаў, у выніку якіх горад сур’ёзна пацярпеў, а таксама наступнае забыццё Першай сусветнай вайны як імперыялістычнай у савецкі час.

З мэтай павышэння экскурсійна-турыстычнага патэнцыялу горада было б мэтазгодна правесці мемарыялізацыю аб’ектаў, пра якія ідзе гаворка, і на аснове гэтага распрацаваць экскурсійны маршрут (напрыклад, «Першая сусветная: па месцах забытай вайны ў Мінску»). Усё гэта спрыяла б аднаўленню гістарычнай справядлівасці і захаванню памяці аб падзеях Першай сусветнай вайны.

*Павел АЛІСІЕВІЧ,*
*студэнт Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка*



*Храм-помнік у гонар Усіх святых і ў памяць аб ахвярах, выратаванню Айчыны нашай паслужылых*



*Будынак, у якім размяшчаўся штаб Заходняга фронту*

# Крыжовыя дарогі Юрыя Тарасюка

*(Працяг. Пачатак у № 37 – 38)*

Пасля яго адправілі на промысел № 2. Там здабывалі нейкую радыёактыўную руду. Пазней стварылі камісію, якая вырашала, хто годны ехаць далей. Усіх зняволеных, якія па стане здароўя маглі працаваць на Поўначы, адправілі туды. Прайшоў камісію і Юрый, хоць і хварэў на цынгу.

Шлях ляжаў на Варкуту, на вугальныя шахты. Дарога была ўжо находжаная. Частку шляху ішлі па сушы, частку – плылі на баржах. Зімой зняволеныя ішлі па рэках як па найбольш зручнай дарозе. Прыйшлі ў лагер Тобыс вясной. Лагер нарыхтоўваў драўніну: валілі лес і сплаўлялі яго па невялікай рэчцы, што моцна разлілася вясной.

Наступным пунктам этапа быў лагер Неасіэль. Тут былі зняволеныя, якіх абвінавачвалі толькі па 58-м артыкуле. Казалі, што пасля выканання працы ўсіх могуць расстраляць. Але пасля таго, як яны нарыхтавалі і ўдала сплавілі драўніну, іх пагрузілі на баржу і адправілі далей.

На баржу ўціснулася шмат людзей. На адным баку яе «быў» 58-ы артыкул, на другім – крымінальнікі. Нярэдка паміж палітычнымі і крымінальнікамі ўзнікалі канфлікты, бо крымінальнікі стараліся адабраць пайкі, курыва. За перагародкай у труме знаходзіліся жанчыны. Яны сядзелі ўсе разам: і крымінальніцы, і палітычныя.

За ўсё падарожжа на баржы зняволеныя не бачылі неба. Па якой рэчцы плылі спачатку, Юрый не помніў, потым была Пячора. Плылі доўга, да ракі Варкуты. У вусці ракі зняволеных высадзілі і па вузкакалейцы павезлі да канечнага пункта – у Варкуту.

На месцы, дзе цяпер знаходзіцца горад, тады нічога не было. Вакол рос дзікі хмызняк – тундра. Шахты былі побач з чыгункай. Прывезлі Юрыя на шахту № 8. Спачатку працаваў на паверхні, адкочваў вагоны, а потым паслалі пад зямлю. Тут ужо не было ніякіх камісіяў. Працаваў на праходцы ў штрэку. Шахта была неглыбокая, распрацоўвалі толькі першы гарызонт. Тут яшчэ не выдзяляўся метан, таму курцы на працы нават дымілі. У шахце працавалі пераважна палітычныя, таму што крымінальнікі прыстасоўваліся да розных лёгкіх работ, а 58-ы артыкул «накіроўвалі» без ніякага патурання на самую цяжкую працу.

Пры шахце пачалі адкрываць курсы, дзе выкладчыкамі былі шахцёры з Данбаса, таксама зняволеныя. Юрый пайшоў на гэтыя курсы. Вучыліся без адрыву ад вытворчасці. Пасля курсаў нядоўга працаваў майстрам, таму што зняволеных па 58-м артыкуле пры першай магчымасці замянялі крымінальнікамі.



*Юрый Тарасюк у канцы 1970-х гадоў*

На шахце Юрый працаваў доўга. З цягам часу колькасць шахтаў і лагераў павялічвалася. Штуршок для ўзнікнення горада Варкута дала самая вялікая шахта «Капітальная». Пад час Вялікай Айчыннай вайны да яе падвялі ўжо сапраўдную чыгунку.

За час зняволення Юрый не раз быў сведкам зверстваў уладаў над арыштантамі. Так, яшчэ да вайны ў Варкуту прыехаў чыноўнік ГУЛАГа, хтосьці Кашкецін. Гэты Кашкецін атрымаў заданне расстраляць некалькі зняволеных. На шахце ён прабыў трохі больш за месяц, і за гэты час па яго загадзе было расстраляна больш за 300 чалавек. Расстрэльвалі без усякай прычыны і нагоды, а затым яшчэ і паведамлялі пра гэта па лагерным радыё. Тры разы Юрый асабіста чуў стрэлы, калі знаходзіўся ў шахце.

Зняволеныя з этапа расказвалі, што яны чулі пра Кашкеціна. Калі той вяртаўся з Варкуты, то яго на дарозе арыштавалі свае ж і тут жа расстралялі. Мэта – замесці сляды злачынстваў у лагерах.

Вайна заканчвалася. Савецкія войскі стаялі каля межаў Германіі. Да гэтага часу тэрмін у Юрыя скончыўся, але пра вызваленне не было і гаворкі. Усіх, чый тэрмін скончыўся, не пускалі на волю. Толькі ў канцы 1944 г. пайшла чутка, што частку зняволеных могуць вызваліць. Юрый пайшоў да свайго інжынера Пятрушына, і той яго запісаў як арыштанта, чый тэрмін скончыўся. Праз месяц па лагерным радыё аб'явілі пра вызваленне, пачуў і Юрый сваё прозвішча.

Вызваліць вызвалілі, але без права выезду. І дакументаў не далі. Выдалі толькі часовыя пашпарты, але і тыя праз колькі часу забралі. Няпэўнасць становішча нарадзіла чутку, што могуць зноў пасадзіць у лагер. Але не: прыкладна праз год вызвалілі і далі пашпарты. Ды зноў без права выезду і на кароткі тэрмін. Толькі па вайне зняволеным сказалі: «Можаце ехаць куды хочаце».

Юрый напісаў ліст сваім бацькам у Казлоўшчыну з надзеяй, што ўсе жывыя. Атрымаў адказ: бацька памёр, сястру Клаўдзію расстралялі фашысты, старэйшы брат Міхаіл прапаў без вестак, малодшага Леаніда дома таксама яшчэ не было.

Вырашыў вяртацца на радзіму. Узяў водпуск, прыехаў. Леанід вярнуўся з партызанаў, жыў у Слоніме. А ў Казлоўшчыне жыла адна маці. Трохі пагасцяваў, не знайшоў працы і вярнуўся ў Варкуту. Становішча яго было ўжо іншае. Вольнанаёмных, да якіх ён адносіўся, пачалі скарачаць – для працы хапала зняволеных. Юрыю параілі ехаць адтуль, не мазоліць вочы, каб не трапіць «пад раздачу». Зноў вярнуўся да маці ў Казлошчыну. На кватэры ў яе жылі святар і ўчастковы міліцыянер Талерчык. Яго потым забілі бандыты. Юрыў уладкаваўся на працу ў сталовую. Усё спачатку ішло добра. Аднойчы ён выпадкова сустрэўся з начальнікам МДБ па Казлоўшчынскім раёне Аршынавым. Аршынаў даведаўся, хто такі Ю. Тарасюк, выклікаў да сябе і наладзіў сапраўдны допыт. Юрый сумленна расказаў пра сваё жыццё. Аршынаў адпусціў Юрыя, але прызначыў час новай сустрэчы. Зноў допыт. Гэты раз пачаў распытваць пра знаёмых з Казлоўшчыны, хто што казаў. Відаць, хацеў выпытаць інфармацыю, за якую можна было б рэпрэсаваць. Сустрэчы з Аршынавым сталі пастаяннымі. Аднойчы выклікаў да сябе раніцай і трымаў да самага вечара, патрабаваў паказанняў пра нейкіх ворагаў. Але Юрый не мог нагаворваць на людзей, даказваў яму, што нічога не ведае. На некаторы час выклікі спыніліся, Юрый працягваў спакойна працаваць.

Аднойчы да маці зайшоў работнік райкама партыі Князюк. Маці была на кухні, Юрый сядзеў у чыстым пакоі. Ён глянуў у пакой, убачыў Юрыя і спытаў у маці, хто гэта, што за чалавек. Яна адказала, што сын. Той не паверыў, сказаў, што не падобны да сына. Маці растлумачыла, што гэта другі сын, які прыехаў з Расіі. Тады Князюк падышоў да Юрыя і пачаў распытваць. Юрый адказваў суха. Князюку гэта не спадабалася, і ён загадаў Юрыю на наступны дзень прыйсці ў райкам.

Князюк сустрэў яго, запрасіў у пакой, дастаў ручку і паперу і загадаў пісаць, хто ён і адкуль. Юрыю не хацелася спавядацца, але давялося пісаць. Напісаў імя, прозвішча, а далей... Не змог, проста не змог, нібы памутненне нейкае найшло. Падумаў: гэта ж здзек! І тут пачуў, што ў суседнім кабінеце Князюк тэлефануе Аршынаву:

– Я сустрэў аднаго цікавага чалавека, але ён не тутэйшы, прыехаў з Расіі. Цяпер ён піша пра сябе, прыходзьце сюды, паглядзіце, – і паклаў трубку.

Хвілінаў праз пятнаццаць пачуліся крокі. Дзверы рэзка адчыніліся, і на парозе паўстаў Аршынаў. Глянуў сурова:

– А ты што тут робіш?

– Князюк прывёў, сказаў пісаць пра сябе. А я не ведаю, што пісаць.

Аршынаў загадаў выбірацца, каб і духу не было. Пайшоў Юрый дадому і задумаўся: вось табе і аўтарытэт партыі, нейкі чыноўнік МДБ можа распараджацца ў райкаме як дома. Замест таго, каб партыя ўсім кіравала, кіруе МДБ.

Юрый вельмі перажываў, не ведаў, чаго яшчэ чакаць. Некаторы час яго ніхто не чапаў, але аднойчы сустрэў Аршынаў на вуліцы і сказаў:

– Ведаеш што, едзь ты адсюль. Калі ты не паедзеш, то мы цябе пасадзім.

– За што? Я ж не краду, не забіваю, сяджу дома, нікому не перашкаджаю. За што вы мяне пасадзіце?

– Я табе сказаў – едзь! – настойваў Аршынаў.

Прыйшоў Юрый дадому і расказаў маці. Маці ў роспач: што рабіць?

Ізноў сустракае Юрыя Аршынаў:

– Ты што, яшчэ не паехаў?

– Куды я паеду?

– Куды хочаш, але едзь. Пасадзім!

Юрый даведаўся, што можна завербавацца. Паехаў у Ваўкавыск, зайшоў у райвыканкам. Там сапраўды сядзеў чалавек і вербаваў у Свярдлоўскую вобласць, у горад Азбест – на працу ў разрэзах, дзе здабываўся азбест. Праца Юрыю была знаёмая.

Атрымаў дакументы, што завербаваны, і вярнуўся дадому чакаць выкліку. Аднойчы зноў сустрэўся з Аршынавым.

– Ты яшчэ не паехаў?

– Чакаю выкліку, вось дакументы, што завербаваны.

Узяў ён дакументы, паглядзеў, пераканаўся і больш Юрыя не чапаў. Месяцы праз два прыйшоў выклік.

Юрый з вялікай ахвотай узяўся за працу. Стараўся, каб зарабіць, добра зажыць, апрануцца, стаць нармальным савецкім чалавекам. З часам прыйшло прызнанне і павага. Пасябраваў з земляком па прозвішчы Вярстак, быў ён з Зэльвы. Працавалі на пару з ім. Потым Юрыю прапанавалі скончыць курсы і працаваць на экскаватары. Працавалася добра, пачало наладжвацца асабістае жыццё. Пасля працы корпаліся ў агародзе, іншы раз хадзілі ў госці.

*Алена АБРАМЧЫК*

*(Заканчэнне будзе)*

# Аксамітны сезон у Мёрскім краі

***Восень – час, калі птушкі ляцяць на поўдзень, а беларусам варта паварочваць на самую поўнач Беларусі, у Мёрскі раён. Там у гэты час для турыстаў сапраўдны аксамітны сезон! Пабачыць сотні жураўлёў на свае вочы, пачаставаціцца балотным суперфудам – журавінамі, даведацца пра восеньскія цікавосткі Мёрскага краю, што прапаноўвае турыстам рэгіён... Сёлета зноў была такая магчымасць у тых, хто 19 верасня наведаў ужо традыцыйнае экалагічнае свята «Жураўлі і журавіны Мёрскага краю», што праходзіць у райцэнтры. Менавіта жураўлям і журавінам прысвечанае мясцовае свята, што праводзіцца ў Мёрах кожны верасень з 2012 года. Яно – квінтэсенцыя мясцовых восеньскіх скарбаў і цікавостак. Тут можна набыць не толькі свежых ягад «толькі-толькі з балота», але і самых розных журавінавых прысмакаў: морс, журавінавы хлеб і слодычы. Экалагічныя гульні і майстар-класы для дзяцей і дарослых дораць цікавы досвед. Для ўдзельнікаў свята арнітолагі ладзяць бясплатнае назіранне за жураўлямі.***

Фестываль ладзіцца ў межах праекта «Разам для грамады і прыроды: Мёрскі раён», што рэалізуецца Мёрскім райвыканкамам, грамадскай арганізацыяй «Ахова птушак Бацькаўшчыны» і Латвійскім сельскім форумам пры фінансавай падтрымцы Еўрапейскага саюза.

Расказваем, чым гатовы здзівіць гэты рэгіён і што трэба не прапусціць у восеньскай вандроўцы на поўнач краіны.

У жніўні і верасні на мясцовыя балоты і палі злятаюцца тысячы шэрых жураўлёў, каб падсілкавацца перад доўгай дарогай у вырай. Гэтыя «чырванакніжныя» птушкі звычайна трымаюцца падалей ад чалавека. Але ўвосень у жыхароў і наведнікаў Мёршчыны ёсць выдатная магчымасць паназіраць за імі, ды яшчэ ў такой колькасці! Відовішча ўражвае настолькі, што многія вяртаюцца сюды яшчэ, каб пабачыць вялізныя чароды грацыёзных птушак на палях і ў паветры, паслухаць іх цудоўныя сумныя крыкі. Экскурсіі на жураўлёў ладзяць заказнік «Ельня» (дырэктар Іван Барок) і гаспадар аграэкасядзібы «Жураўліная Ельня» Андрэй Літвінаў.

Заварожвае і прыроднае хараство гэтых мясцінаў.

– Нашы балоты прыгожыя ў любую пару года, – кажа мясцовая захавальніца дзікай прыроды Кася Казачонак, якая таксама водзіць экскурсіі на балоты. – Увосень вельмі прыгожа цвіце верас, лес размалёўваецца яркімі фарбамі, балота шчодра частуе журавінамі, брусніцамі, грыбамі. Бабіным летам ідзеш ранкам па балоце, і ўсё пераліваецца: кругом карункі павуціння, і на ім кроплі вісяць. У гэты час вельмі многа птушак – пералётныя гусі і жураўлі збіраюцца ў чароды, гул стаіць – цікава паслухаць, як яны лятуць. Я лаўлю рыбу на донку і цэлую ноч магу сядзець на возеры, а на світанні люблю слухаць, як жураўлі прачынаюцца і пачынаюць зноў курлыкаць, гулёкаць, а пасля пералятаюць на поле і кормяцца.

Восень – сезон збору журавінаў. Мёрскі раён славіцца найбуйнейшымі ў Беларусі запасамі гэтых балотных ягад. Мясцовыя аграэкасядзібы прапаноўваюць не толькі спазнавальныя вандроўкі па балоце і назіранні за птушкамі, але і збор ягад.



Мёры і раён вартыя таго, каб прабыць там не адзін дзень. Спыніцца можна ва ўтульных аграэкасядзібах, якіх у раёне з'яўляецца ўсё больш: ёсць попыт турыстаў, якія адкрываюць для сябе нязведаны паўночны куток Беларусі. Багата і іншых варыянтаў, дзе адпачыць: гатэлі, санаторый, база адпачынку, дамы паляўнічых і рыбаловаў і кемпінг.

А можна выправіцца на вуліцу Дзяржынскага ў райцэнтры, адшукаць дом № 18 з муралам у выглядзе дывана-маляванкі, знайсці на ім 10 славутасцяў раёна і наведаць іх усе! У якасці падказкі – спіс:

касцёл Узнясення Найсвяцейшай Дзевы Марыі ў Мёрах;

касцёл Маці Божай Шкаплернай у вёсцы Мілашова;

вадаспад на рацэ Вята;

каменны крыж у вёсцы Авечкі;

калона ў гонар Канстытуцыі 3 траўня 1791 года ў мястэчку Лявонпаль;

касцёл Беззаганнага Зачацця Найсвяцейшай Дзевы Марыі ў Дзісне;

храм Уваскрэсення Хрыстова ў Дзісне;

званіца Траецкай царквы ў мястэчку Лявонпаль;

ферма па гадоўлі высакароднага аленя ў вёсцы Ніўнікі;

руіны каменнай званіцы ў вёсцы Навалока.

І абавязкова па вандроўцы павінны застацца сувеніры на памяць! Тутэйшыя майстры робяць іх сваімі рукамі з экалагічных матэрыялаў: воўны, раслінаў, гліны. Брошкі, магніты, бірулькі, кашалькі, фірмовыя мёрскія пернікі – усё гэта непаўторныя маленькія скарбы, якія будуць нагадваць пра вандроўку. А некаторыя майстры і гаспадары аграэкасядзібаў нават праводзяць майстар-класы для тых, хто хоча зрабіць уласны сувенір самастойна.

Бадай што не лішнімі будуць некалькі карысных спасылак, каб было прасцей запланаваць вандроўку (не сёлета, дык налета):

спіс аграэкасядзібаў Мёршчыны з пералікам іх паслуг: https://yadi.sk/i/E079IJFVamQG2w;

аграэкасядзіба «Жураўліная Ельня»: https://www.facebook.com/zhuravlinayayelnya;

санаторый «Расінка»: https://www.agrozdrav.by/resort/rosinka;

база адпачынку «Актам»: https://aktam.by/baza-otdyha-aktam;

кемпінг «Мярэя»: http://mereyacamp.by;

заказнік «Ельня»: https://www.facebook.com/reserve.yelnya;

аленевая ферма ў Ніўніках: http://obsterno.by.

Трэба прыехаць, а ўжо тут арнітолагі і дырэктар заказніка «Ельня» патлумачаць, чаму мясцовыя балоты вартыя доўгай вандроўкі.

*Паводле паведамленняў ГА «Ахова птушак Бацькаўшчыны»*
*Фота прадастаўленыя АПБ*

# Адзіная і такая родная ў карцінках

***(Працяг. Пачатак у №№ 36, 37 – 38)***

***Карцінка дзясятая***. Цёплы вясковы вечар, вуліца ў калдобінах. Ліхтароў на слупах няма. Але нам, вясковай моладзі, тыя ліхтары і не патрэбны. Гурт дзяўчатак і хлопцаў збіраецца ля Баркоўскай хаты. Гаспадар выносіць радыёлу, круціцца дыск пласцінкі, гучыць музыка, а моладзь весела танчыць. І што цікава, ніводзін сусед ніколі не сказаў, што мы яму замінаем. Вось так на той вясковай дыскатэцы я сустракаю сваё каханне. Гэта мой аднавяскоўвец, студэнт БДУ, прыгожы, спакойны і працавіты хлопец. У 1976 годзе мы ўзялі шлюб.

*Вяселле ў роднай вёсцы, у цэнтры – жаніх Міхаіл Бабко, ідуць выкупаць нявесту, 1976 г.*



***Карцінка адзінаццатая***. Я працую ў роднай вёсцы ў медыцынскім пункце. Вясковая дакторка, так мяне завуць мае землякі, як кажуць, дзе нарадзілася, там і згадзілася. Няма ніводнай хаціны, куды б мяне не запрашалі да хворых. Па роднай вуліцы я прайшла за трыццаць гадкоў не адну сотню кіламетраў. Па тых жа калдобінах, лужынах, гразі ці пяску.

***Карцінка дванаццатая***. Вёска мая размешчана ў чыстым полі. Няма ні лесу, ні рэчкі. Але ж яна такая родная! У гэтай вёсцы жыў мой прадзед Арсень Аляшкевіч, дзед Ігнат Аляшкевіч, тата Віктар Аляшкевіч, нарадзілася я, нарадзіліся двое маіх дзяцей. Канец сямідзясятых гадоў. Ля вёскі пабудаваны і працуе Другі салігорскі калійны камбінат. Вакол гараць агні, дарогі пад асфальтавым пакрыццём. А мая родная, найраднейшая вуліца, адзіная ў вёсцы Радкава, патанае ў гразі.

*Валянціна БАБКО-АЛЯШКЕВІЧ*

***(Заканчэнне ў наступным нумары)***



*Электраманцёр Віктар Аляшкевіч праводзіць электрыфікацыю роднай вёскі, 1959 г.*

# Смуглевіч і пачатак віленскай школы жывапісу

**Францішак Смуглевіч (1745 – 1807), жывапісец, графік, педагог, творчая дзейнасць якога звязаная з мастацкім жыццём Беларусі, Польшчы, Літвы, Расіі, – 275 гадоў з дня нараджэння.**

Яго першымі настаўнікамі былі бацька мастак Лукаш Смуглевіч (апроч Францішка, яшчэ чатыры яго сыны звязаныя з выяўленчым мастацтвам) і сваяк Шыман Чаховіч.

У 1763 – 1764 гадах вучыўся ў Рыме ў Антоніа Марона, з 1765 года як стыпендыят караля Станіслава Аўгуста наведваў Рымскую акадэмію Святога Лукі. Там Ф. Смуглевіч працаваў над інтэр'ерам касцёла Святога Станіслава, таксама супрацоўнічаў з Вінчэнца Брэна пры інвентарызацыі палаца Нерона (Domus Aurea). Капіяваў творы выбітных майстроў.

У 1784 годзе вярнуўся на радзіму. Жыў і працаваў у Варшаве і Вільні. У Варшаве заснаваў прыватную школу жывапісу. У Вільні заснаваў кафедру жывапісу і малюнка ў Галоўнай віленскай школе, у 1803 годзе ператворанай у імператарскі Віленскі ўніверсітэт, і кіраваў ёю, будучы прафесарам. Гэта быў пачатак гэтак званай віленскай школы жывапісу. Яго вучнямі былі Іосіф Аляшкевіч, Юзаф Пешка, Мацей Тапольскі, Матэвуш Такарскі, Ян Рустэм ды інш.



У 1800 – 1801 гадах па запрашэнні цара Паўла І працаваў у Санкт-Пецярбургу, афармляў інтэр'еры Міхайлаўскага замка.

Жывапіс Ф. Смуглевіча па сваім характары класіцыстычны (пераважна карціны на тэмы старажытнай гісторыі і Бібліі, партрэты; алегарычныя і побытавыя сцэны), з элементамі барока. Пісаў карціны для касцёлаў Варшавы ды іншых гарадоў. У віленскім касцёле Святых Пятра і Паўла знаходзіцца адно з палотнаў Смуглевіча на рэлігійную тэму – «Развітанне свв. Пятра і Паўла» (1804).

Ён аўтар цыкла акварэляў з відамі архітэктурных помнікаў Вільні (1785; Мастацкі музей Літвы) – крыніцы каштоўнай інфармацыі пра былыя ці незваротна страчаныя збудаванні. Дзякуючы шматлікім рэпрадукцыям шырока вядомыя акварэлі Смуглевіча, якія зафіксавалі браму віленскай гарадской сцяны і развалінны каралеўскага замка ў Вільні.

У 1790 годзе пачаў серыю малюнкаў і літаграфіяў у сто гравюраў, што ілюстравалі гісторыю польскай нацыі, напісаную Адамам Нарушэвічам.

Разам з братам Антоніем маляваў фрэскі палацаў у Дабжыцы, Смілаве і Любострані. Таксама ў 1802 годзе яны дэкаравалі залу пасяджэнняў у Галоўнай віленскай школе (цяпер Зала Смуглявічуса Вільнюскага ўніверсітэта – чытальная зала рэдкай кнігі ўніверсітэцкай бібліятэкі). Гэтыя фрэскі прадстаўлялі 12 антычных персанажаў: Сакрата, Плутарха, Піндара, Анакрэонта, Гесіёда, Геракліта, Арыстоцеля, Еўрыпіда, Дыягена, Гамера, Архімеда і Платона.

Памёр у Вільні, пахаваны на могілках Роса. Аднак дакладнае месца яго пахавання было невядомае ўжо ў канцы XIX стагоддзя.

*Падрыхтаваў Алесь САЧАНКА*

*У наступным нумары газеты чытайце эсэ Людмілы Рублеўскай пра выбітнага мастака.*

# Энцыклапедыя жыцця над Нёманам

***Жыццё і творчасць вядомай польскай пісьменніцы беларускага паходжання Элізы Ажэшкі звязаныя цеснымі сувязямі з Беларуссю. Нарадзілася яна на Гродзеншчыне, апошнія гады прайшлі ў Гродне, тут яна памерла і была пахаваная. Дадамо, што ў гэтым горадзе яе імя носіць вуліца, тут ёй усталяваны помнік, працуе яе дом-музей.***




*Анатоль Бутэвіч распавядае пра кнігу «Над Нёманам»*

Маладыя гады пісьменніцы прайшлі на Палессі, у сённяшнім Драгічынскім раёне, дзе яна была замужам за Пятром Ажэшкам; потым прыняла актыўны ўдзел у паўстанні 1863 – 1864 гадоў. Водгулле яго адчуваецца ў яе цыкле навелаў «Gloria victis» («Слава пераможаным»). Матывы паўстання і ў яе буйным рамане «Над Нёманам», створаным у 1887 годзе, дзе апісаны побыт і жыццё беларускіх сялянаў, падзеі, што адбываліся на Гродзеншчыне. У 2000 годзе ў серыі «Беларускі кнігазбор» выйшаў аднатомнік Э. Ажэшкі, дзе змешчаныя тэматычна звязаныя з Беларуссю аповесці «Хам», «Дзюрдзі», «Нізіны» і вялікі нарыс «Людзі і кветкі над Нёманам». Цяпер жа, праз 20 гадоў, чытачы могуць прачытаць па-беларуску найбольш значны твор пісьменніцы раман «Над Нёманам» і цыкл «Слава пераможаным». Том нядаўна выдадзены ў серыі «Беларускі кнігазбор» Выдавецкім домам «Беларуская навука». Пераклаў раман і навелы перакладчык, празаік і крытык, дыпламат Анатоль Бутэвіч. Прадмову напісала даследчыца творчасці і жыццёвага шляху Э. Ажэшкі, галоўны рэдактар часопіса «Маладосць» Святлана Воцінава.

Пры канцы верасня ў Музеі гісторыі беларускай літаратуры адбылася прэзентацыя гэтага тома. Вяла рэй на імпрэзе супрацоўніца музея Эліна Свірыдовіч. Аб жыцці і творчасці выдатнай пісьменніцы распавядалі Анатоль Бутэвіч, Святлана Воцінава, галоўны рэдактар серыі «Беларускі кнігазбор» пісьменнік Кастусь Цвірка, старшыня Беларускага фонду культуры Тадэвуш Стружэцкі, гісторык і краязнаўца Зміцер Юркевіч. Музыка, паэт і кампазітар Раман Арлоў парадаваў прысутных выкананнем сваёй песні.

Пачалося ўсё своеасаблівымі ўводзінамі ў радавод пісьменніцы, якім падзяліўся З. Юркевіч. Ён разважаў аб праблеме «як называць пісьменніцу?», ці не прыспеў час пашыраць беларускую форму яе прозвішча – Арэшка, спасылаўся на розныя крыніцы, дзе фігуруюць формы Арэшка, Арэшкава, нават – Арэшчыха. Прычым, гэта фіксуецца і ў навуковых выданнях, даследаваннях па шляхецкіх радаводах як нашага, так і мінулага стагоддзяў. А выступленне С. Воцінавай стала своеасаблівай невялікай лекцыяй пра выбітную пісьменніцу: яе жыццё на Гродзеншчыне, сувязі з паўстанцамі 1863-га, яе фальклорныя запісы.

– Анатоль Бутэвіч перакладае розных польскіх аўтараў (Багуслаў Радзівіл, Станіслаў Лем, Рышард Курыльчык ды інш.), – зазначыў Т. Стружэцкі. – Відаць, гэта ўдзячнасць Польшчы і палякам за добрыя стасункі, за кантакты. Што ж да Э. Ажэшкі, дык варта нагадаць, што яна двойчы намінавалася на Нобелеўскую прэмію. На жаль, пісьменніца доўгі час не была запатрабаваная... Сёння ж мы разумеем, што і яна, і яе творы павінны быць шырока вядомыя, іх павінны ведаць сучасныя беларусы, бо Ажэшка апісвала нашую супольную з палякамі гісторыю, дзякуючы ёй мы ўспомнілі многія забытыя моманты з уласнай гісторыі. Яе праца была пазней асноваю для сучасных даследчыкаў беларускай даўніны, фальклору, традыцыяў.

Пры канцы сустрэчы выступіў перакладчык:

– Чаму была зацікаўленасць гэтым творам? Гэта адзін з вяршынных твораў Э. Ажэшкі. Па-другое, там гучаць блізкія мне матывы. Пазней я ў даследчыкаў прачытаў, што раман «Над Нёманам» – у адным шэрагу з «Панам Тадэвушам» А. Міцкевіча і «Новай зямлёй» Якуба Коласа. Калі сур'ёзна задумацца, то так і ёсць. Матывы, характары, сюжэты, праблемы – закранутае ў «Над Нёманам» гучыць і ў гэтых творах. Гэта стаўленне да зямлі, стасункі паміж багатымі і беднымі... Паралелі бачныя. Калі працаваў над перакладам, усё больш ажывала думка, што ёсць яшчэ адзін аўтар, з якім блізкая Ажэшка. Гэта Іван Мележ, яго «Палеская хроніка». Тое, што яна бачыла ў свой час, пабачыў у сваім пераламленні Мележ. І яшчэ адзін нюанс, чаму я ўзяўся за пераклад. Ёсць эпізоды, дзе аўтар апісвае травы, зёлкі, дадае маляўнічыя апісанні паўсядзённасці, сярод іх – жніво. І я не мог не ўспомніць, што калі гэтым займалася мая маці, то ў час працы спявала. У той час гэта было натуральным: працаваць і спяваць.



*Святлана Воцінава і Анатоль Бутэвіч пад час прэзентацыі*

Далей перакладчык адзначыў, што варта мець на ўвазе: усе падзеі, што адбываюцца ў «Над Нёманам» – адбываюцца на нашых землях, у «Gloria victis» – таксама. Калі мы хочам ведаць, як і што адбывалася ў нашым краі, лічыць ён, варта звяртаць увагу на творы пісьменнікаў іншых народаў, якія паказваюць падзеі на нашых землях у сваіх творах. Магчыма, па-свойму, але паказваюць нашыя падзеі, беларускі край.

Асобна выступоўца звярнуў увагу на цыкл навелаў:

– Здаецца, сказаўшы «было паўстанне 1863 года», мы ўсё сказалі. Але – што было? як было? якія характары? якія ўзаемаадносіны? як усё адбівалася ў людскіх лёсах? Гэта Ажэшка бачыла сама. Калі мы цяпер пачнем вывучаць цыкл «Gloria victis», ён будзе паказваць, якім было тое паўстанне, дадаваць дэталі.

Напрыканцы прэзентацыі А. Бутэвіч падараваў кнігу «Над Нёманам» дырэктару музея Міхаілу Рыбакову, а таксама адказаў на пытанні прысутных і раздаў аўтографы.

*Лявон ЦЕЛЕШ,*
*Уладзімір ПУЧЫНСКІ*
*Фота Уладзіміра ПУЧЫНСКАГА*

## Лістапад

**1 – Крыловіч Уладзімір Мікалаевіч** (1895, Дзяржынскі р-н – 1937), акцёр тэатра і кіно, адзін з заснавальнікаў беларускага тэатра, заслужаны артыст Беларусі – 125 гадоў з дня нараджэння.

**1 – Пакаташкін Валянцін Пятровіч** (1940, Гомель), мастак, педагог, заслужаны настаўнік Беларусі, выдатнік народнай адукацыі Беларусі, узнагароджаны ордэнам свяціцеля Кірылы Тураўскага – 80 гадоў з дня нараджэння.

**2 – Алесь Барскі** (сапр. **Баршчэўскі Аляксандр Андрэевіч**; 1930), паэт, літаратуразнаўца, публіцыст, перакладчык, фалькларыст, педагог, грамадска-культурны дзеяч з Польшчы, узнагароджаны ордэнам Ф. Скарыны – 90 гадоў з дня нараджэння.

**2 – Алесь Наварыч** (сапр. **Трушко Аляксандр Іванавіч**; 1960, Столінскі р-н), пісьменнік, лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2005) – 60 гадоў з дня нараджэння.

**3 – Бонч-Асмалоўскі Глеб Анатольевіч** (1890, Пухавіцкі р-н – 1943), вучоны ў галіне антрапалогіі і археалогіі, які першым выявіў рэшткі неандэртальца на тэрыторыі СССР, – 130 гадоў з дня нараджэння.

**3 – Глогер Зыгмунт** (1845 – 1910), археолаг, этнограф, гісторык, фалькларыст, даследчык матэрыяльнай і духоўнай культуры Польшчы, Беларусі, Літвы – 175 гадоў з дня нараджэння.

**3 – Пархоменка Уладзімір Паўлавіч** (1940, Чачэрскі р-н – 2017), вучоны-педагог, выдатнік адукацыі Беларусі, выдатнік друку Беларусі – 80 гадоў з дня нараджэння.

**4 – Смірын Майсей Мендэлевіч** (1895, Дзісна – 1975), гісторык-медыявіст, замежны член АН Германіі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1948) – 125 гадоў з дня нараджэння.

**5 – Асновіч Сямён (Самуіл) Пятровіч** (1920, Бабруйск – 2005), скрыпач, заслужаны артыст Беларусі – 100 гадоў з дня нараджэння.

**6 – Карунас Васіль Канстанцінавіч** (1950, Шарашова), архітэктар, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1998) – 70 гадоў з дня нараджэння.

**6 – Ходзька Леанард** (1800, Маладзечанскі р-н – 1871), выдавец, гісторык, публіцыст, бібліёграф – 220 гадоў з дня нараджэння.




## «Струменіць Нёман срэбраводны»

***Уздоўж***

**1**. Частка сушы, якая вуглом выходзіць у возера, мора. **8**. ... і рака – шчасце для рыбака (прык.). **9**. Месца для стаянкі, пагрузкі і разгрузкі суднаў; некалі на Нёмане быў буйны ... у Стоўбцах. **10**. ... і Нёманец; невялікія рэчкі, вытокі Нёмана. Паводле легенды, асілак Нёман, якога за маўклівасць называлі Неманцам, і дзяўчына ... кахалі адно аднаго. **12**. «... – Нёман». Сумесны савецка-французскі авіяцыйны полк, які праславіўся сваімі подзвігамі ў часы вайны з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. **15**. ... «з варагаў у грэкі» або «Бурштынавы ...». Так называлі водную гандлёвую дарогу, што па Нёмане і іншых рэках Беларусі праходзіла ад Балтыйскага мора да Чорнага. **16**. Рыбалоўная снасць. **17**. У спартыўных гульнях вызначаны адрэзак часу. **20**. Пробны выраб. **21**. Славянская багіня вады, апякунка рэк. **24**. «... наша слаўная Нёман, // Чысцейшая чэрвеньскіх рос». З песні «Песня пра Нёман» (сл. А. Астрэйкі, муз. Н. Сакалоўскага). **25**. Штучнае рэчышча, напоўненае вадой; праз Агінскі ... Нёман злучаецца з басейнам Дняпра, праз Аўгустоўскі – з басейнам Віслы. **28**. Металічны стрыжань, які ўтрымлівае на месцы судна, бакен. **30**. Выбірай ... па лоўлі, а кручок па рыбе (прык.). **33**. Пясняр. **34**. Чым за морам ... піць, лепш з Нёмана вадзіцу (прык.). **35.** Складка на адзежыне. **36**. Партовае збудаванне для рамонту суднаў.

***Упоперак***

**2**. Рыбацкі .... Месца стаянкі рыбакоў. **3**. Асоба, якая праводзіць судны па фарватэры. **4**. Старажытны буйны горад на беразе Нёмана. **5**. На бязрыб'і і апалонік – ... (прык.). **6**. Клаўдзій .... Старажытнагрэчаскі географ, астраном, матэматык, які ўключыў Нёман у «Карту Еўрапейскай Сарматыі». **7**. Сумка, у якой носяць карты. **11**. Рэмень ці вяроўка; прадмет вупражы. **13**. Горад на беразе Нёмана, дзе знаходзіцца найбуйны ў Беларусі шклозавод «Нёман». **14**. Невялікая пералётная пеўчая птушка. **18**. «Струменіць Нёман срэбраводны // У сваіх прыўдалых берагах». З верша Якуба Коласа «Высокі ...». **19**. «... і кветкі над Нёманам». Вялікі нарыс Элізы Ажэшкі, аўтара рамана «Над Нёманам». **22**. Лепшая сярод іншых падобных. **23.** ..., віціна, барка – рачныя судны, што некалі хадзілі па Нёмане. **26**. Тое, што ўпрыгожвае што-небудзь. **27**. Пра што-небудзь вельмі прыгожае (разм.). **29**. ... дубы – не дуброва (прык.). **31**. Разблытаеш след – будзе дзічына на ... (прык.). **32**. Грунт пад вадой мора, ракі, возера.

*Склаў Лявон ЦЕЛЕШ*




### Адказы на крыжаванку, змешчаную ў № 37 – 38

***Уздоўж***: **1**. Кіпа. **8**. Баркас. **9**. Рыба. **10**. Ракі. **12**. Чараўніца. **15**. Уцеха. **16**. Тураў. **17**. Пхоў. **18**. Якар. **19**. Мора. **20.** Стыр. **21**. Снег. **23**. Рака. **24**. Драга. **27**. Вецер. **29**. Газовачка. **32**. Ласо. **33**. Неон. **34**. Ліпень. **35**. Ухіл.

***Упоперак***: **2**. Пціч. **3**. Баласт. **4**. Даліна. **5**. Пыл. **6**. Ластаўка. **7**. Красуня. **11**. Сак. **13**. Перамычка. **14**. Ахвотніца. **20**. Струмень. **22**. Герадот. **25**. Разліў. **26**. Асанна. **28**. Ага! **30**. Алюр. **31**. Ноч.

**Шаноўныя чытачы, падпісчыкі!**

**Наступны нумар «Краязнаўчай газеты» згодна з графікам выйдзе *6 лістапада*.**
**Беражыце сябе і родных!**
**Будзем разам і надалей!**
**Не забывайцеся таксама, што яшчэ можна падпісацца на лістапад і снежань.**
**Ужо ідзе падпіска на 1-е паўгоддзе 2021 года.**

### *Народ сказаў...*

– І вы хочаце аддаць сваю дачку за гэтага тыпа? А вы ведаеце, што ён сядзеў чатыры гады ў крымінале?
– Вось як?! Ну і ашуканец! А мне казаў, што ўсяго два гады.

**Поп.** Чым грашна?
**Баба.** У новай спадніцы прыйшла.
**Поп.** Я пытаю, чым грашыла?
**Баба.** Была вялікая, дык перашыла…
**Поп.** Глухая цяцера!
**Баба.** Ну, як няма цяпера, дык заўтра прыйду.

Селянін прыехаў з горада і кажа свайму суседу:
– От жа ў горадзе смачныя булкі!
– А ты каштаваў?
– Ды не, я якраз бачыў, як адзін паніч еў.

*Ішоў адзін чалавек, а насустрач яму кум.*
*– Што вязеш, куме?*
*Кум злез з воза, падышоў і на вуха шэпча:*
*– Авёс.*
*– А чаму ты па сакрэце мне гаворыш?*
*– Каб конь не пачуў.*

– Чаму ты, дзяўчынка, у такое добрае надвор'е ходзіш пад парасонікам?
– Бо як ідзе дождж, мама забірае.

*– Куме! Як гэта з тэлеграфам робіцца: пацісну на адным канцы, а гавораць на другім?*
*– Гэта, брат, акурат, як з сабакам: пацягні яго ззаду за хвост, а ён спераду забрэша.*

– Слухай, ты мне прадаў сляпую кабылу.
– Гэта ж табе лепей: яна будзе есці салому, а думаць, што есць сена.

*Паводле зборніка «Беларускія народныя жарты» (сабраў Змітро Бяспалы; Мінск, 1970)*

# Малая краязнаўчая энцыклапедыя

***(Пачатак у № 1 за 2003 год)***

**«ПРУ́СКІ МУР»** – гістарычная назва спецыфічнага тыпу агарадакальнай канструкцыі будынкаў (фахверка) на тэрыторыі Беларусі. Аснову канструкцыі складае драўляны каркас з вертыкальных стоек, злучаных гарызантальнымі бэлькамі, раскосамі і крыжовымі сувязямі. Прамежкі паміж элементамі каркаса запаўнялі каменем, цэглай або глінай, нярэдка атынкоўвалі і бялілі, а каркас заставаўся адкрытым і ўтвараў на паверхні сцен характэрны дэкаратыўны малюнак.

Тэхніка «прускага муру» запазычаная з Заходняй Еўропы, была пашыраная ў XV – XVII стст. у будаўніцтве пераважна малапавярховых абарончых збудаванняў (брама замка ў аг. Астрашыцкі Гарадок Мінскага раёна), жылых, гаспадарчых і вытворчых будынкаў, ужывалася да пачатку XX ст. (жылыя дамы ў в. Грозаў Капыльскага, в. Заазер'е Нясвіжскага, гаспадарчая пабудова ў в. Манькавічы Столінскага, вадзяны млын у в. Гярвяты Астравецкага раёнаў). У XVIII ст. дэкаратыўныя матывы «прускага муру» выкарыстоўваліся для аздаблення сценаў манументальных драўляных будынкаў (брама Пінскага замка).



*Жылы дом, пабудаваны ў тэхніцы «прускага муру», в. Заазер'е Нясвіжскага раёна (пач. XX ст.)*

У канцы XX – пачатку XXI ст. «прускі мур» зноў пачалі скарыстоўваць пры пабудове прыватных жылых дамоў і катэджаў.

**ПРУ́СЫ** – група заходнябалцкіх плямёнаў, якія ў 2-й палове 1-га – першых стагоддзях 2-га тысячагоддзя н.э. насялялі ўзбярэжжа Балтыйскага мора паміж ніжнім цячэннем Віслы і Нёмана. У XIII ст. заваяваныя Тэўтонскім ордэнам, большай часткай асіміляваныя немцамі; частка прусаў перасялілася ў Літву, Польшчу. На землях Беларусі, згодна з Валынскім летапісам, упершыню з'явіліся ў 1276 – 1278 гг. у раёнах Гродна, Слоніма і Ваўкавыска. Увайшлі ў склад беларускай народнасці. Сляды існавання прусаў на беларускіх землях захаваліся ў тапанімічных назвах з коранем «прус» (Прусін, Прусіна, Прусінава, Прусавічы, Прусы, Прусікі, Прусаўшчына, Прусаўкі, Прусінічы) у Гарадоцкім, Лагойскім, Капыльскім, Касцюковіцкім, Крупскім, Крычаўскім, Пастаўскім, Салігорскім, Слонімскім, Старадарожскім, Талачынскім, Уздзенскім раёнах.

**ПРУТ,** *прэнт* – даўняя мера даўжыні (7,5 локця, або 4,87 м) і плошчы (23,7 $м^2$) на тэрыторыі Беларусі. Ужываўся пры пазямельных вымярэннях. Адзінка, у 10 разоў меншая за прэнт, называецца прэнцік.

**ПРЫБАЛТЫ́ЙСКАЯ КУЛЬТУ́РА** – археалагічная культура плямёнаў бронзавага веку, якія ў 1-й палове 2-га тысячагоддзя да н.э. насялялі Беларускае Панямонне і паўднёва-ўсходнюю Прыбалтыку.

Асноўны занятак насельніцтва – прымітыўнае земляробства і жывёлагадоўля. Паселішчы размяшчаліся на берагах вадаёмаў. Наземныя прамавугольныя ў плане жытлы мелі 2-схільную страху. Унутры жытлаў былі адкрытыя агмені, абкладзеныя камянямі. Пахавальны абрад – трупапалажэнне (нябожчыкаў хавалі ў глыбокіх ямах у скурчаным становішчы на баку), пахаванні адзіночныя і калектыўныя.

Насельніцтва выраблялa амфары і гаршкі з акрэсленай шыйкай, арнаментаваныя гарызантальнымі шнуравымі адбіткамі і ялінкавымі ўзорамі з насечак або нарэзак. Сярод упрыгожанняў – падвескі з прасвідраваных зубоў жывёлаў, бурштынавыя трубчатыя пацеркі, разнастайныя падвескі, кружкі з адтулінамі, стылізаваныя фігуркі чалавека, аздобы ў выглядзе двухлязовых сякерак і інш.

**ПРЫВІЛЕ́І** (лац. privilegium ад privus асаблівы + lex закон) – заканадаўчыя акты, якімі ў Вялікім Княстве Літоўскім, Рэчы Паспалітай і інш. феадальных дзяржавах вялікія князі ці каралі надавалі або пацвярджалі асаблівыя правы паноўнага класа, саслоўя, пэўных сацыяльных ці этнічна-рэлігійных груп, асобаў. Да выдання Статутаў ВКЛ 1529, 1566, 1588 гг. прывілеі – асноўная крыніца пісанага права на землях Беларусі, адна з крыніцаў вывучэння феадальнага грамадства, помнік старабеларускай канцылярска-юрыдычнай мовы.

Класіфікуюцца на льготныя, дарчыя, ахоўныя. Былі прывілеі земскія, абласныя, гарадскія, валасныя. Першыя земскія прывілеі на беларускіх землях выдадзеныя ў 1387 г. Вядомыя Гарадзельскі прывілей 1413 г., Гродзенскі 1432 г., Прывілей 1434 г., Прывілей 1447 г., Аляксандраў 1492 г. Самыя старажытныя абласныя прывілеі – Полацкія і Віцебскія (выдаваліся ў XIV – 1-й палове XVII ст., вызначалі дзяржаўна-прававое становішча Полацкай і Віцебскай зямлі ў ВКЛ). З ростам гарадоў і павелічэннем іх ролі ў эканамічным развіцці выдаваліся прывілеі асобным гарадам – магдэбургскае права.



*Гарадзельскі прывілей 1413 г.*

Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 384 ад 08 мая 2014 г.
Заснавальнікі: грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд культуры»; Гілеп Уладзімір Аляксандравіч.

Краязнаўчая газета
Індэкс індывідуальнай падпіскі – 63320
ведамаснай – 633202

**Галоўны рэдактар – Уладзімір ГІЛЕП.**
**Намеснік галоўнага рэдактара Уладзімір Пучынскі.**
**Рэдкалегія:** Анатоль Бутэвіч, Навум Гальпяровіч, Вітольд Ермалёнак, Алесь Карлюкевіч, Людміла Кірухіна, Адам Мальдзіс, Сяргей Мітраховіч, Вячаслаў Рагойша, Павел Сапоцька, Віктар Скорабагатаў, Тадэуш Стружэцкі.

Наш адрас: 220029, г. Мінск, вул. Траецкая набярэжная, 6. Тэл. 283-28-26. Тэл./факс 334-42-03 E-mail: kraga@tut.by

З-за абмежаванасці сродкаў выданне безганарарнае. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, імя і імя па бацьку, асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Меркаванні аўтараў могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі.
Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
Пры передруку спасылка на «Краязнаўчую газету» абавязковая.

Падпісана да друку: 22.10.2020
Газета надрукавана ў друкарні ТДА «Знамение» (Мінск, вул. Каржанеўскага, 14). Ліцэнзія ЛП № 02330/85 ад 29.03.2004.
Заказ 503.
Тыраж 390 асобнікаў.